ДАПАМАГАЕМ. ПА-ЧАЛАВЕЧЫ І ПА-СУСЕДСКУ

2

У ЧЫМ ШЧАСЦЕ УЛАДЗІМІРА РАДЗІВІЛАВА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

3 САКАВІКА 2022 г. ЧАЦВЕР № 43 (29665)

## ЛІЧБА ДНЯ

### 1,8 млн тон нафты

*плануе здабыць у 2022 годзе «Беларуснафта». Кожны год кампанія павялічвае аб'ёмы здабычы. Калі папярэднія перыяды планамерна нарошчваліся аб'ёмы па 20 тысяч тон у год, то цяпер павінна быць узята планка 70 тысяч тон да плана 2021 года — павелічэнне здабычы на 70 тысяч тон нафты ў год становіцца зыходнай кропкай для новага этапу здабычы нафты ў рэгіёне. Беларускія нафтавікі вырабляюць у тым ліку і запасы, якія раней лічыліся недаступнымі або нерэнтабельнымі. Гэта стала магчымым дзякуючы сучасным тэхналогіям бурэння свідравін і асваення складаных, нетрадыцыйных, ультранізкапранікальных калектараў.*

# Дзе пачынаецца бульба?

Фота БелТА.

У Навукова-практычным цэнтры Нацыянальнай акадэміі навук па бульбаводстве і плодаагароднінаводстве на гэтае пытанне вам дакладна адкажуць: «У прабірцы». Тут, у лабараторыях, з выкарыстаннем сучасных тэхналогій ідзе работа над атрыманнем новых сартоў нацыянальнага прадукту айчыннай селекцыі.

***На здымку**: лабарант Вікторыя САВІЦКАЯ.*

## КОРАТКА

- **У Цэнтрвыбаркам паступілі пратаколы тэрытарыяльных камісій па рэферэндуме аб устанаўленні вынікаў галасавання.**
- Беларускія вучоныя ацанілі ўзровень клеткавага імунітэту супраць COVID-19 праз 3, 6 і 9 месяцаў.
- **Фонды НББ папоўніліся выданнем 1900 года гогалеўскіх «Мёртвых душ».**
- Студэнты БДУ навучаць школьнікаў прававым асновам праз сучасныя гульні.
- **Больш за 200 чалавек сталі ўдзельнікамі акцыі па экспрэс-тэсціраванні на ВІЧ у Мінску.**

Прэм'ера рубрыкі

## НАЙНОЎШАЯ ГІСТОРЫЯ: ВЕДАЦЬ І РАЗУМЕЦЬ

Падзеі апошняга часу ў свеце ўвогуле і зусім побач з намі зрабілі вельмі актуальнай адну вядомую фразу: «Няўжо гісторыя нічому не вучыць?» Задаём у паветра гэтае», нібы рытарычнае, пытанне, а самі ўсё ж на яго спрабуем знайсці адказ. Які, як правіла, нараджае новыя пытанні: «А ці ведаем мы гэтую самую гісторыю, каб пачаць у яе вучыцца? Ці разумеем, што адбывалася ў нашай краіне і вакол яе дзесяць, сто, пяцьсот гадоў таму?» Адказваючы ўжо на іх, са здзіўленнем усведамляем: менш і горш мы ведаем менавіта пра найноўшую гісторыю — тую, што бліжэй да нас па часе, у якой удзельнічалі, якую стваралі не нейкія міфічныя прашчуры, а дзяды і прадзеды. Але ж менавіта на ёй, найноўшай, такой багатай на падзеі, нам і варта вучыцца, каб не паўтараць памылак папярэднікаў.

У Год гістарычнай памяці «Звязда» разам з Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук распачынае новую рубрыку «Найноўшая гісторыя». У ёй дасведчаныя спецыялісты раскажуць пра падзеі такога блізкага XX стагоддзя, пра якое многія ведаюць далёка не ўсё. Менавіта аб тых момантах, аб якіх многія зусім няшмат ведаюць, але якія значна паўплывалі на жыццё Беларусі і беларусаў, мы і будзем весці гаворку.

Пачнём з падзеі, якая адбылася роўна сто чатыры гады таму, — падпісання Брэсцкага мірнага дагавора.

СТАР. 15

У цэнтры ўвагі

## РАБОТА З МОЛАДДЗЮ — НЕ ДЗЕЛЯ «ПТУШАЧКІ»

**«Мы жывём у няпросты час і працуем у няпростых умовах, але асноўная задача — навучанне і выхаванне дзяцей і моладзі — павінна абавязкова выконвацца. Для гэтага патрабуюцца ваш прафесіяналізм, адказнае стаўленне да справы, а яшчэ дысцыпліна і парадак. Толькі так можа быць забяспечана паспяховае развіццё вашых устаноў адукацыі, галіны і дзяржавы ў цэлым, — падкрэсліў у выступленні на выніковай калегіі Міністэрства адукацыі намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

Год гістарычнай памяці

# «НАШАЙ ГІСТОРЫЯЙ МОЖНА І ТРЭБА ГАНАРЫЦЦА»

**Беларусі патрэбна свая тактыка для ўмацавання бачання гістарычнага мінулага ў краіне і за яе межамі. Аб гэтым заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА на пасяджэнні Рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы.**

Фота БелТА.

Распараджэнне аб стварэнні адмысловай структуры пры сваёй Адміністрацыі падпісаў месяц таму Прэзідэнт. Узначаліць савет Ігар Сергеенка, але функцыянаваць ён будзе на базе Нацыянальнай акадэміі навук. У склад структуры ўвайшлі вядомыя вучоныя ў галіне гуманітарных ведаў, аўтарытэтныя грамадскія дзеячы, прадстаўнікі палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў, экспертнай супольнасці, дзяржорганаў і арганізацый.

«Мяркуецца, што савет будзе вызначаць асноўныя напрамкі развіцця гістарычнай палітыкі ў нашай краіне, абмяркоўваць асобныя пытанні, якія датычацца перыядаў гісторыі, ацэнкі перыядаў гісторыі, вызначаць напрамак навуковых даследаванняў, — перадае словы Ігара Сергеенкі БелТА. — Увесь комплекс мерапрыемстваў будзе накіраваны ў першую чаргу на захаванне гістарычнай памяці, удакладненне асобных, магчыма, спрэчных момантаў у нашай гісторыі».

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта таксама адзначыў, што сёння гістарычная памяць беларусаў падвяргаецца атакам і разнастайным фальсіфікацыям. Прычым апаненты дзейнічаюць на перспектыву, спрабуюць дэзарыентаваць грамадзян, распаўсюджваецца шмат фэйкаў.

«І мы, вядома, павінны прапрацоўваць падыходы, вызначаць сваю тактыку для ўмацавання бачання гістарычнага мінулага не толькі ў нас у краіне, але і за мяжой», — сказаў Ігар Сергеенка.

**Старшыня праўлення Беларускага таварыства «Веды» Вадзім ГІГІН** падкрэсліў, што ў нашай краіне сёння асаблівая ўвага ўдзяляецца гісторыі: «Тут важна падкрэсліць: беларуская дзяржава не хоча палітызаваць гісторыю. Наадварот, мы хочам абараніць гістарычную навуку, выкладанне гісторыі ад фальсіфікацый, маніпуляцый, уплыву звонку».

Ён звярнуў увагу, што ў рэгіёне і ў свеце часта гісторыю спрабуюць выкарыстоўваць не для вывучэння падзей мінулага і выхавання грамадзяніна, а для таго, каб сутыкаць нацыі, распальваць грамадзянскую і сацыяльную варожасці.

**Старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір ГУСАКОЎ** заявіў журналістам, што некаторыя перыяды нашай гісторыі недастаткова даследаваны і «прыватызаваны» іншымі дзяржавамі.

«Таму трэба аднавіць сваю гісторыю — сапраўдную, аб'ектыўную, без фальсіфікацый, праўдзівую. Наш народ мае найглыбейшыя гістарычныя карані, па сваёй значнасці не горшыя, чым любы еўрапейскі народ або дзяржава. Нашай гісторыяй можна і трэба ганарыцца», — сказаў Уладзімір Гусакоў.

Ён дадае, што стварэнне Рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы мае вялікае значэнне для Беларусі і на яго базе мае быць выбудаваць гістарычную палітыку, ідэалагічную работу.

**Намеснік міністра адукацыі Аляксандр КАДЛУБАЙ** на пасяджэнні ў сваю чаргу падкрэсліў, што на ўроках гісторыі ў школах павінна давацца канкрэтная ацэнка падзеям, якія адбыліся. «Што датычыцца курса школьнай гісторыі, асабліва гісторыі Беларусі, у педагогаў, выкладчыкаў гісторыі ёсць патрэба ў канкрэтных ацэнках па пэўных гістарычных падзеях», — адзначыў ён.

Паводле яго слоў, напрыклад, Айчынная вайна 1812 года ў падручніку сусветнай гісторыі і падручніку гісторыі Беларусі ацэньваецца па-рознаму.

Яшчэ адзін прыклад прывёў **старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Ігар МАРЗАЛЮК.** Гісторык звярнуў увагу, што ў падручніках па гісторыі Беларусі расказваецца аб нацыянальных вызваленчых паўстаннях, але ці сапраўды яны былі арганізаваны беларусамі ці проста здарыліся на тэрыторыі краіны.

«Якія паўстанні сапраўды нашы, а якія проста былі фактамі на нашай тэрыторыі? Гэтыя моманты патрабуюць непрадузятага навуковага даследавання», — падкрэсліў дэпутат.

Прысутнічаў на савеце і **першы намеснік міністра замежных спраў Беларусі Сяргей АЛЕЙНІК**, які расказаў пра дзейнасць МЗС па захаванні гістарычнай памяці. Так, ведамства вядзе работу па міжнародным прызнанні генацыду беларускага народа. Акцэнт прапануецца зрабіць на двухбаковых перагаворах, у першую чаргу з дружалюбнымі краінамі, а не на прасоўванні гэтай тэмы на міжнародных пляцоўках.

«Аб'ектыўна кажучы, аанаўская пляцоўка, як мы ўсе бачым, сёння ператварылася ў поле ідэалагічнага бою. І там ідуць дастаткова сур'ёзныя баталіі», — заявіў ён.

Дыпламат таксама адзначыў, што ў частцы захавання гістарычнай памяці беларускі бок таксама актыўна ўзаемадзейнічае з замежнымі дыяспарамі.

**Марыя ДАДАЛКА.**

На слыху

# «АКАЗВАЕМ ДАПАМОГУ ТЫМ, ХТО МАЕ ПАТРЭБУ»

**Гомельшчына аператыўна адгукнулася на просьбы жанчын і дзяцей з Украіны даць ім прытулак і аказаць гуманітарную дапамогу ў крызіснай сітуацыі.**

Днямі ў Добрушскім раёне да беларускіх пагранічнікаў звярнуліся грамадзяне Украіны з просьбай прыняць каля 25 сем'яў бежанцаў. У сераду з самай раніцы да пагранічнага пераходу «Андрэеўка» ў Добрушскім раёне для арганізацыі сустрэчы і размяшчэння ўкраінцаў на тэрыторыі Гомельскай вобласці прыбылі прадстаўнікі аблвыканкама, МНС, ДАІ і вайскоўцы. З боку Украіны да беларускай граніцы падышлі 15 жыхароў суседняй краіны — большасць дзеці, толькі чацвёра дарослых; прайшлі адпаведную рэгістрацыю. Па паведамленнях тых, хто сустрэў бежанцаў, украінцы дзякавалі, што вельмі баяліся: раптам Беларусь не прыме. Рады, што хваляванні аказаліся марнымі. Чакаюць, калі іх давязуць да месца, каб патэлефанаваць і супакоіць родных, якія засталіся ва Украіне.

Кіраўніцтвам Гомельскай вобласці было прынята рашэнне размясціць вымушаных мігрантаў у адным з санаторыяў Гомельскага раёна, дзе загадзя ўсё было падрыхтавана для прыняцця 60 чалавек.

Яшчэ ў чаканні бежанцаў Гомельская абласная арганізацыя Беларускага Чырвонага Крыжа даставіла да месца меркавання размяшчэння грамадзян Украіны партыю гігіенічных і прадуктовых набораў.

**Член Савета Рэспублікі, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа Ала СМАЛЯК** адзначыла, што нацыянальнае аддзяленне таварыства ў адпаведнасці з прынцыпамі працуе нейтральна.

— Мы не прымаем нічый бок. Мы ўсяго толькі аказваем дапамогу тым, хто мае ў гэтым патрэбу, — адзначыла сенатар.

Ала Смаляк нагадала, што рэгіянальная арганізацыя Беларускага Чырвонага Крыжа мае досвед работы з мігрантамі з Украіны яшчэ з 2014 года, таму гатова аказаць шырокую падтрымку ўсім, хто будзе мець у гэтым патрэбу. У Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа ёсць усё неабходнае для аказання такой дапамогі.

Прадстаўнікі ўлады і грамадскіх арганізацыяў кантралявалі сустрэчу грамадзян Украіны на месцы. На тэрыторыю санаторыя ў Гомельскі раён прыехалі **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Мікалай РАГАШЧУК** і **старшыня Гомельскага райвыканкама Сяргей ЕРМАЛІЦКІ.**

Мікалай Рагашчук адзначыў, што асабіста прыехаў у санаторый упэўніцца, як і ў якіх умовах размясціліся сем'і з Украіны.

— Сёння да нас прыбылі першыя грамадзяне з Украіны ў сувязі з падзеямі, якія там адбываюцца. Іх размясцілі ў добра ўпарадкаваных пакоях аднаго з карпусоў санаторыя ў Гомельскім раёне. Там цёпла, добра. У першую чаргу іх накармілі. У найбліжэйшы час іх агледзяць урачы, зробяць экспрэс-тэсты на кавід. Далей будзем працаваць з імі. Яны тут будуць знаходзіцца столькі, колькі ім неабходна, — падкрэсліў памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці.

Як адзначаецца, пры неабходнасці ў санаторыі гатовы прыняць і як мінімум удвая больш бежанцаў. У пакоях цёпла і камфортна, у некаторых ёсць двух'ярусныя ложкі. Тым жа сем'ям з Украіны, хто ўжо засяліўся, аказваюць кансультатыўную дапамогу псіхолагі МНС па Гомельскай вобласці. Дзеткам перадалі кніжкі, размалёўкі і прапісі.

Між тым таксама на тэрыторыі Гомельшчыны беларускі бок аказвае падтрымку кіроўцам больш як 10 украінскіх фур. Ужо некалькі дзён дальнабойшчыкі з Украіны не могуць вярнуцца на радзіму. Стыхійныя стаянкі з фур утварыліся ў абласным цэнтры, на Рэчыцкай трасе, на пад'ездзе да вёскі Новая Гута ў Гомельскі раён. У кіроўцаў-украінцаў узніклі цяжкасці з безнаяўнымі разлікамі на запраўках і ў магазінах. Аб складанай сітуацыі з сацыяльных сетак стала вядома ў аблвыканкаме і на прадпрыемстве «Гомельаблаўтатранс».

— Беларусь не дзеліць людзей, у адрозненне ад «дэмакратычнага» свету, на сваіх і чужых. Беларусь дапамагае. Транспартнікі вылучылі прыстасаванае месца пад агульную стаянку для ўсіх фур, што затрымаліся ў рэгіёне. Тут ёсць усе неабходныя бытавыя ўмовы. Удалося вырашыць пытанне па зняцці наяўных грошай, — адзначаецца ў паведамленні тэлеграм-канала «Гомельшчына афіцыйна».

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

**У ТЭМУ**

Гомельскія медыкі аказалі медыцынскую дапамогу ўкраінскаму хлопчыку, якога днямі даставілі ў абласную бальніцу ў цяжкім стане. Гомельская абласная арганізацыя Беларускага Чырвонага Крыжа наведала ў бальніцы сямігадовага Улада, якія цяпер адчувае сябе добра.

Вечарам 28 лютага да беларускага пункта спрошчанага пропуску «Паддабранка» з украінскай тэрыторыі прыехала сям'я з сямігадовым дзіцем (усе грамадзяне Украіны). Бацькі хлопчыка звярнуліся да беларускіх пагранічнікаў з просьбай даставіць сына ў бальніцу.

— Па словах маці, у дзіцяці на працягу пяці дзён назіраліся сімптомы ацэтанеміі, высокая тэмпература і слабасць у нагах. Яго стан пагаршаўся. Таксама грамадзяне Украіны патлумачылі, што даехаць да найбліжэйшых украінскіх медустаноў з-за наяўнай абстаноўкі праблематычна і небяспечна. Таму яны вырашылі прыехаць да пункта пропуску на граніцы з Беларуссю, — адзначылі ў Дзяржпагранкамітэце.

Беларускія пагранічнікі прапусцілі жанчыну з дзіцем на тэрыторыю Беларусі. Брыгада хуткай дапамогі, якая прыбыла на месца, даставіла іх у Гомельскую абласную дзіцячую клінічную бальніцу, затым перавялі ў інфекцыйную бальніцу.

Вечарам у сераду маленькі пацыент з Украіны быў выпісаны у сувязі з выздараўленнем.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Байдэн заклікаў прыцягнуць да адказнасці кіраўніцтва сацсетак за «эксперымент над дзецьмі»

**Прэзідэнт ЗША Джо Байдэн лічыць, што кіраўніцтва сацыяльных сетак неабходна прыцягнуць да адказнасці за правядзенне «эксперыменту над дзецьмі». Адпаведную заяву ён зрабіў, выступаючы перад Палатай прадстаўнікоў і Сенатам Кангрэса ЗША са штогадовым пасланнем «Аб становішчы краіны».**

«Як прадэманстравала (былая супрацоўніца кампаніі Facebook. — **Заўв. рэд.**) Фрэнсіс Хаўген, мы абавязаныя прыцягнуць сацыяльныя платформы да адказнасці за правядзенне агульнанацыянальнага эксперыменту над нашымі дзецьмі дзеля выгады», — заявіў Джо Байдэн.

Паводле яго слоў, «прыйшоў час узмацніць абарону асабістых даных, забараніць паказ дзецям таргетаваных рэкламы, а таксама запатрабаваць таго, каб тэхналагічныя кампаніі перасталі збіраць асабістыя даныя дзяцей».

У кастрычніку 2021 года ў Сенаце Кангрэса ЗША адбыліся першыя слуханні па пытанні бяспекі дзяцей у інтэрнэце. У цэнтры ўвагі аказалася Фрэнсіс Хаўген, якая сцвярджае, што ў Facebook, перайменаванай у тым жа месяцы ў Meta, ведалі аб псіхалагічных праблемах, якія выклікаюць у падлеткаў ее сацсеткі, асабліва Instagram, аднак не прымалі мер, каб выправіць шкодныя практыкі. Наадварот, яны заахвочваліся, паколькі садзейнічалі росту ўцягнутасці карыстальнікаў.

### У Савеце Федэрацыі папярэдзілі Фінляндыю аб наступствах уваходжання ў НАТА

**Расія адмоўна паставіцца да магчымага ўваходжання Фінляндыі ў НАТА, сказаў член камітэта Савета Федэрацыі па міжнародных справах Сяргей Цэкаў.**

Паводле яго слоў, Фінляндыя знаходзіцца наводшыбе Еўропы і мяжуе з Расіяй, таму такое рашэнне нічога станоўчага не прынясе. Тым самым краіна створыць сабе дадатковыя праблемы, папярэдзіў сенатар.

«Фінляндыя не была дзяржавай, у якой фарміравалася «анты-Расія». А ва Украіне гэтую дзяржаву стваралі, мілітарызавалі, напампоўвалі яе ўзбраеннем, таму і праводзіцца спецыяльная аперацыя», — растлумачыў Цэкаў.

# На беларускае грамадства вядзецца інфармацыйная атака

## Але краіна здольная належным чынам абараніць свой суверэнітэт

**Беларусь узмацняе паўднёвую граніцу і разгортвае там дадатковыя батальённыя групы. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на нарадзе з членамі Савета бяспекі і кіраўніцтвам Савета Міністраў.**

«Прыняты генераламі нашымі прэвентыўныя дзеянні і замест пяці батальённых тактычных груп. Замест пяці мы разгортваем дзесяць. Заўтра-паслязаўтра па адным, па два мы будзем да дзесяці нарошчваць намаганні на паўднёвай граніцы. Гэта высокападрыхтаваныя манеўраныя групы, якія гатовы спыніць любую правакацыю і любыя ваенныя дзеянні супраць Беларусі», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што апошнім часам з'явілася інфармацыя, што з боку ўкраінскай тэрыторыі могуць быць спробы пранікнення ў Беларусь дыверсійных груп. У сувязі з гэтым ён паставіў задачы сілавым структурам спыняць такія спробы, калі яны будуць зроблены.

### Ва ўзмоцненым рэжыме

Складаная абстаноўка вакол Беларусі мабілізавала асабовы склад Узброеных Сіл, нават дробныя парушэнні сышлі на нішто. Аб гэтым заявіў журналістам начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Віктар Гулевіч пасля нарады Прэзідэнта з членамі Савета бяспекі і кіраўніцтвам Савета Міністраў, паведаміла БелТА. Паводле яго слоў, на нарадзе кіраўнік дзяржавы паставіў задачу прадоўжыць узмацненне дзяржграніцы, разгарнуць дадатковыя сілы і сродкі, якія забяспечаць ваенную бяспеку краіны на паўднёвым, паўночна-заходнім, заходнім аперацыйных напрамках.

Як адзначыў Віктар Гулевіч, Узброеныя Сілы пастаянна адсочваюць, аналізуюць абстаноўку вакол Беларусі. І яна мае тэндэнцыю да эскалацыі. У пацвярджэнне сваіх слоў начальнік Генштаба нагадаў аб выказваннях генеральнага сакратара НАТА Енса Столтэнберга аб тым, што сілы першачарговага задзейнічання альянсу будуць прывадзіцца ў павышаную ступень боегатоўнасці. «Гэта даволі вялікая групоўка, якая можа знаходзіцца на граніцах з Беларуссю», — адзначыў Віктар Гулевіч.

Ён таксама звярнуў увагу, што на фоне складанай абстаноўкі вакол Беларусі настроі сярод ваеннаслужачых крыху змяніліся. «Магчыма, менавіта такая складаная абстаноўка мабілізавала ўвесь асабовы склад Узброеных Сіл, нават дробныя парушэнні сышлі на нішто», — сказаў начальнік Генштаба. Ён падкрэсліў, што УС заўсёды знаходзяцца ў гатоўнасці для абароны суверэнітэту краіны: «Мы не маем ніякіх агрэсіўных планаў у адносінах да сумежных краін. У першую чаргу для нас — абарона граніцы, абарона нашай тэрытарыяльнай цэласнасці», — падкрэсліў ён.

Абарона дзяржаўнай граніцы Беларусі ажыццяўляецца ва ўзмоцненым рэжыме. Аб гэтым

Фота БелТА.

паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце Беларусі. Па ўказанні Прэзідэнта, аддадзеным з улікам абвастрэння ваенна-палітычнай сітуацыі ў рэгіёне, узмоцнена абарона граніцы на заходнім і паўднёвым напрамках. На фоне існуючай абстаноўкі для прадухілення магчымых правакацый і недапушчэння пранікнення на тэрыторыю Беларусі дыверсійна-разведвальных груп рэалізуецца комплекс рэжымных мерапрыемстваў. У рамках дадатковага прыкрыцця граніцы з Украінай задзейнічаны рэзервы пагранічных груп і атрадаў, а таксама падраздзяленні Міністэрства абароны.

Асабовы склад тэрытарыяльных органаў пагранічнай службы знаходзіцца ў пунктах пастаяннай дыслакацыі. Пункты пропуску, у тым ліку на беларуска-ўкраінскай граніцы, з беларускага боку функцыянуюць у штатным рэжыме. Дадатковыя абмежаванні ў пропуску асоб і транспартных сродкаў не ўводзіліся. Сітуацыя на дзяржаўнай граніцы Беларусі застаецца пад кантролем.

### Супраць фэйкаў

Адказваючы на пытанні журналістаў, Віктар Гулевіч са стапрацэнтнай упэўненасцю заявіў: беларускія ваеннаслужачыя выконваюць задачы толькі на тэрыторыі Беларусі, нікога з іх няма на тэрыторыі Украіны. Ні пад Чарнігавам, ні пад Кіевам няма і не можа быць беларускіх ваеннаслужачых. Аб гэтым БелТА заявіла афіцыйны прадстаўнік Міністэрства абароны Ына Гарбачова.

Інфармацыя, якая распаўсюджваецца асобнымі ўкраінскімі СМІ аб калоне ў складзе 300 танкаў, якая нібыта рухаецца ў напрамку Украіны, з'яўляецца чарговым фэйкам. Такое паведамленне прэс-службы Мінабароны размешчана ў тэлеграм-канале міністэрства. «У Беларусі адсутнічаюць такія вайсковыя фарміраванні, як танкавыя арміі. Аб гэтым ведаюць нават школьнікі», — адзначылі ў прэс-службе.

Дарэчы, абвяргаць фэйкі дапамагаюць і ўкраінскія ўлады. Кіеў не мае даных аб удзеле ваенных Рэспублікі Беларусь у баявых дзеяннях супраць Украіны. Пра гэта заявіў саветнік кіраўніка Офіса прэзідэнта Украіны Аляксей Арастовіч, паведамляе УНІАН.

Усе выдумкі збеглых аб нашых ваенных ва Украіне — хлусня. Аб гэтым заявіў БелТА загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага ўпраўлення Інстытута сацыялогіі НАН кандыдат філасофскіх навук Мікалай Шчокін. «На праведзеным пашыраным пасяджэнні Савета бяспекі Аляксандр Лукашэнка раскрыў дэталі падзей, якія адбываюцца вакол Беларусі, перагаворнага працэсу дэлегацыі Расіі і Украіны, а таксама ваеннай аперацыі ва Украіне расійскіх спецпадраздзяленняў. Больш за тое, ужо стала зразумела, што дзякуючы Аляксандру Лукашэнку Беларусь не была ўцягнута ў ваенныя дзеянні. Ніводны ваеннаслужачы Беларусі не прымае ўдзел у баявых дзеяннях як на тэрыторыі краіны, так і за яе мяжой. Усе выдумкі збеглых і праплачаных інфармацыйных каналаў Захаду аб нібыта ўдзеле беларускай арміі ў ваенных дзеяннях ва Украіне — хлусня. У сувязі з гэтым лічу, што збеглыя павінны быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасці за падбухторванне і распальванне варожасці, а таксама за падрыў дзяржаўнага суверэнітэту і паклёп», — сказаў Мікалай Шчокін.

«У Беларусі асаблівая місія ў рэгіёне. Мы — ключ у рэгіёне Усходняй Еўропы, таму такая вялікая геапалітычная гульня ідзе вакол нашай краіны. Але мы свой шлях выбралі. Гэта выбар нашага народа. Мы — саюзнік Расіі. Мы Расіі ніколі не здрадзім. Мы прыкрываем з захаду і паўночнага захаду нашу агульную Саюзную дзяржаву, — адзначыў БелТА старшыня праўлення беларускага таварыства «Веды» Вадзім Гігін. — І з Расійскай Федэрацыяй мы каардынуем нашы дзеянні. Мы аказваем Расіі падтрымку і лагістычную, і гуманітарную. Разам з тым якой-небудзь неабходнасці у тым, каб нашы сілавікі — ці то ўзброеныя сілы, пагранічнікі або спецпадраздзяленні — удзельнічалі ў спецыяльнай ваеннай аперацыі, няма. І Расійская Федэрацыя нас аб гэтым не прасіла. Насамрэч у Расіі хапае сіл і сродкаў для выканання тых задач, якія былі пастаўлены».

### Жорсткая рэакцыя

Ідуць канкрэтныя правакацыі. Такой думкай з карэспандэнтам БелТА падзяліўся палітолаг, эксперт грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Пётр Пятроўскі, каментуючы інфармацыйныя ўкіды аб тым, што беларускія войскі ўвайшлі ў Чарнігаўскую вобласць. «Ёсць пэўныя правакатары. Хутчэй за ўсё, звязаныя з трэцімі сіламі англасаксонскага свету, якія хочуць разгарнуць беларуска-ўкраінскую вайну. Мы павінны гэта разумець. І пасля таго, як Прэзідэнт дае дакладную інфармацыю, што няма такіх войскаў і няма такіх планаў, — адносна нас вядуцца такія інфармацыйныя правакацыі і ўкіды. Хтосьці вельмі хоча, і мы павінны быць гатовы (і Прэзідэнт аб гэтым сказаў) да магчымых правакацый, у тым ліку ваенных. Таму поўная баявая гатоўнасць на паўднёвых граніцах для адбіцця магчымых правакацый», — адзначыў Пётр Пятроўскі.

Паводле яго слоў, на беларускае грамадства зараз вядзецца інфармацыйная атака. «Сіламі інфармацыйна-псіхалагічных аперацый краін НАТА і Украіны. Мэта правакацый і атакі — пасеяць паніку і падбіць насельніцтва да незаконных масавых акцый і беспарадкаў, спробы паўтарыць 2020 год. Гэта значыць, спрабуюць Беларусь зноў увесці ў бездань 2020-га. Але мы ведаем, што любыя формы дзяржпераваротаў вядуць да войнаў. Таму тыя, хто пад гэта падбухторвае насельніцтва, хоча распаўсюдзіць псіхоз», — адзначыў палітолаг.

Аналіз аператыўнай абстаноўкі ў краіне сведчыць, што мы фактычна знаходзімся ў стане інфармацыйнай вайны, заявіў намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік крымінальнай міліцыі Генадзь Казакевіч. Пра гэта паведамілі ў МУС. «Канкрэтнымі прыкладамі інфармацыйных нападаў з'яўляюцца заклікі па блакіраванні чыгуначных шляхоў, вывядзенні са строю сігнальнага абсталявання і гэтак далей. Такія заклікі мы зафіксавалі ўжо 27 лютага ад Bypol, затым ад іншых збеглых і дэструктыўных ініцыятыў. Усе яны адкрыта заклікаюць грамадзян да пашкоджання чыгуначных шляхоў, сродкаў арганізацыі руху, знішчэння рухомага саставу. Гэта значыць, да ўсяго таго, што прывядзе да тэхнагенных і экалагічных катастроф, ахвяр сярод мірнага насельніцтва, — адзначыў Генадзь Казакевіч. — З 28 лютага на 1 сакавіка на тэрыторыі Магілёўскай, Гомельскай і Мінскай абласцей зафіксаваны тры факты знішчэння сігнальнага абсталявання, блакіравання чыгуначных пуцей. Адказнасць узялі на сябе «Буслы ляцяць» і Bypol. Усе гэтыя дзеянні кваліфікаваны як акты тэрарызму, узбуджана крымінальная справа. Інфраструктура Беларускай чыгункі ўзята пад кантроль органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў».

У ноч з 1 на 2 сакавіка ў Стоўбцах затрыманы мясцовыя жыхары, муж з жонкай, якія на чыгуначных шляхах падпалілі бярвенне для перашкоды руху цягнікоў. Абодва былі ў стане алкагольнага ап'янення. Мужчына ўсё здымаў на мабільны тэлефон з адпаведным каментарыем, дзе адкрыта выказваў свае тэрарыстычныя намеры. Яму пагражае да 20 гадоў пазбаўлення волі. «МУС звяртае ўвагу, што ўсе такія заклікі паступаюць ад збеглых, якія знаходзяцца за мяжой. Заклікаючы да міру ва Украіне, яны фактычна заклікаюць да вайны і ўчынення тэрактаў у нашай краіне. Прыведзеныя факты мы расцэньваем як акты тэрарызму. І нясуць яны пагрозу, у першую чаргу чаргу, не дзяржаве, а людзям, — адзначыў намеснік міністра. — У Жодзіне затрыманы яшчэ адзін 35-гадовы «рэйкавы партызан». Мы працягваем аператыўныя мерапрыемствы і, як абяцалі, знойдзем усіх і абаронім нашых грамадзян».

Генадзь Казакевіч падкрэсліў: «Папярэджваем усіх, хто нават падумае ўчыняць любыя супраць-праўныя дзеянні на Беларускай чыгунцы: усе яны будуць кваліфікаваны як акт тэрарызму, і рэакцыя будзе максімальна жорсткай».

**Пётр ДУНЬКО.**

### ❍ У тэму

У Міністэрстве замежных спраў Беларусі пракаментавалі прыпыненне работы Пасольства ЗША ў Мінску і чарговую порцыю санкцый. Адпаведныя заявы зрабіў БелТА прэс-сакратар МЗС Беларусі Анатоль Глаз. «У той час, як беларускі бок прыкладае паслядоўныя намаганні па нармалізацыі сітуацыі ва Украіне, у тым ліку аказваючы ўсебаковае садзейнічанне арганізацыі расійска-ўкраінскіх мірных перагавораў, афіцыйны Вашынгтон працягвае нагнятаць абстаноўку ў рэгіёне і тыражаваць фэйкі для апраўдання новых санкцыйных мер у адносінах да Рэспублікі Беларусь», — сказаў Анатоль Глаз.

«Яшчэ раз падкрэсліваем тое, аб чым неаднаразова заяўляў беларускі бок: наша краіна не прымала, не прымае і не плануе прымаць удзел у баявых дзеяннях на тэрыторыі Украіны, — заявіў прадстаўнік МЗС. — У логіку нікому непатрэбнага цяпер нагнятання ўкладваецца і рашэнне амерыканскага боку аб прыпыненні работы Пасольства ЗША ў Мінску: на фоне заяў аб неабходнасці дээскалацыі і падтрымання адкрытымі каналаў для дыялогу на справе гэтыя каналы закрываюцца, каб яшчэ больш ускладніць любую камунікацыю, у тым ліку і па практычных пытаннях, уключаючы тэматыку бяспекі ў рэгіёне».

У МЗС Беларусі чарговы раз нагадваюць усім ініцыятарам увядзення абмежавальных мер, што любыя санкцыйныя выпады не застануцца без адэкватнага адказу. «І гэта нашкодзіць усім. Адзіным ключом да разрадкі напружанасці і дасягнення ўзаемаразумення з'яўляецца раўнапраўны і паважлівы дыялог», — падкрэсліў прэс-сакратар.

### ❍ Тым часам

Прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка даручыў прапрацаваць магчымасць адвязкі разлікаў за энерганосьбіты ад долара падчас пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў, перадае БелТА. «Задача віцэ-прэм'еру, міністру энергетыкі, старшыні «Белнафтахіма» — гэта пытанне адвязкі нашых разлікаў ад доларaў ЗША, магчыма, з пераходам на фіксацыю ў расійскіх рублях, у першую чаргу па энерганосьбітах», — падкрэсліў Раман Галоўчанка.

Як заўважыў кіраўнік урада, трэба максімальна пераарыентаваць беларускі экспарт з украінскага рынку. Паводле яго слоў, па выніках мінулага года экспарт ва Украіну складаў амаль $5,5 млрд, або 13 працэнтаў усяго беларускага экспарту. «Па разліках Міністэрства эканомікі, прыняць гэтыя аб'ёмы могуць Расія, КНР на суму $1,9 млрд і $1,7 млрд адпаведна. Даручаю Мінэканомікі давесці да галін наменклатуру і аб'ёмы, якія падлягаюць пераарыентацыі з украінскага рынку», — адзначыў прэм'ер-міністр.

# РАБОТА З МОЛАДДЗЮ — НЕ ДЗЕЛЯ «ПТУШАЧКІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— У Год гістарычнай памяці не толькі перад сістэмай адукацыі, але і перад усімі сферамі, перад кожным грамадзянінам стаяць пэўныя задачы. Урадам быў зацверджаны адпаведны план па Годзе гістарычнай памяці. Зацверджаны галіновыя планы, у тым ліку на ўзроўні Міністэрства адукацыі, — паведаміў Ігар Петрышэнка.— Сістэма адукацыі, як ніякая іншая, уцягнута ў гэты працэс. Больш за тое, Міністэрства адукацыі з'яўляецца каардынатарам усёй работы па патрыятычным выхаванні.

Віцэ-прэм'ер канстатаваў, што ў апошнія паўтара года асабліва востра акрэсліліся праблемныя і болевыя кропкі ў арганізацыі работы з моладдзю, у першую чаргу гэта пытанні ідэалагічнай работы. «Неабходна выключыць фармалізм пры правядзенні мерапрыемстваў з моладдзю, не трэба рабіць гэта дзеля «птушачкі» ці справаздачы. Неабходна знаходзіць новыя формы і метады работы, якія адпавядаюць сучасным рэаліям, — падкрэсліў ён. — Асаблівая ўвага — студэнцкай моладзі. Работа з ёй не павінна быць фармалізаваная, важна не прапусціць карысныя ініцыятывы, якія зыходзяць ад маладых, і пачынаць трэба з грамадскіх аб'яднанняў. Наша задача — накіраваць энергію маладых у стваральнае рэчышча, а лакаматывам маладзёжнага руху павінен стаць Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. У Год гістарычнай памяці неабходна арганізаваць у студэнцкім асяроддзі правядзенне розных дыскусій і дыспутаў, каб сфарміраваць у маладых людзей пачуццё датычнасці да лёсу сваёй краіны, каб яны зрабілі неабходныя высновы ў працэсе жывога дыялогу пакаленняў. Яшчэ адзін напрамак — грамадска карысная дзейнасць. Хацелася б, каб студэнцкая моладзь была больш актыўна задзейнічана ў будаўніцтве інтэрната і іншых аб'ектаў Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка: гэта могуць быць суботнікі ці працоўныя дэсанты. Магчыма, студэнты прапануюць свае ідэі — творчы патэнцыял моладзі трэба выкарыстоўваць па максімуме».

З 1 верасня гэтага года ўступае ў дзеянне абноўлены Кодэкс аб адукацыі, напружаная работа над якім вялася на працягу некалькіх апошніх гадоў. Ён павінен вывесці на якасна новы ўзровень усю галіну. Ігар Петрышэнка падкрэсліў, што Міністэрства адукацыі разам з зацікаўленымі ведамствамі павінна забяспечыць дакладную і напружаную работу па ўкараненні ўсіх інавацый. У гэтым пытанні важны комплексны падыход, трэба ліквідаваць усе недахопы ў заканадаўстве, што маюцца, і прывесці заканадаўчыя і нарматыўныя акты ў адпаведнасць з новым кодэксам і новымі правіламі прыёму ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Не менш важная шырокая тлумачальная работа па навацыях кодэкса з навучэнцамі, іх бацькамі, педагогамі і ўвогуле ў грамадстве. Праводзіць яе трэба так, каб абсалютна кожнаму ўсё было зразумела, каб не засталося ніякіх пытанняў, а для гэтага ў поўнай ступені павінен быць задзейнічаны патэнцыял СМІ, інтэрнэту і сацыяльных месенджараў.

**Міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ** у сваім выступленні на калегіі запэўніў, што сістэма адукацыі Беларусі будзе спакойна функцыянаваць і развівацца незалежна ад знешніх фактараў.

«На кожным з узроўняў у нас ёсць сёння і поспехі, і ў той жа час пэўныя пытанні і праблемы. Калі казаць пра ўстановы дашкольнай адукацыі, то па краіне іх дастатковая колькасць. Але пытанне крокавай даступнасці дзіцячых садкоў пакуль што застаецца нявырашаным. З боку міністэрства

Фота з сайта adu.gov.by

**Намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА і міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ.**

мы прапануем шэраг падыходаў, якія дазволяць шмат у чым вырашыць гэтую праблему. Калі казаць пра ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі, тут мы бачым, што ўзровень падрыхтоўкі навучэнцаў павінен увесь час расці. Увядзенне цэнтралізаванага экзамену з 2023 года дазволіць нам зрабіць поўны і ўсебаковы аб'ектыўны аналіз паспяховасці нашых навучэнцаў па матэматыцы, рускай ці беларускай мове», — сказаў Андрэй Іванец.

Паводле яго слоў, вельмі важна, што Беларусь інтэгравана ў міжнародныя адукацыйныя платформы. «Такую, напрыклад, як PISA, якая дае магчымасць правесці ацэнку ўзроўню адукаванасці нашых навучэнцаў. Вынікі ўдзелу беларускіх падлеткаў у 2018 годзе ў міжнародным незалежным даследаванні паказваюць, што мы ўваходзім у ТОП вядучых краін свету, — адзначыў міністр. — Вельмі важнае пытанне — падрыхтоўка кадраў у галіне прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Тут мы чакаем, што сумесная работа з заказчыкамі кадраў, арганізацыя дзейнасці рэсурсных цэнтраў дазволіць нам істотным чынам павысіць прывабнасць рабочых прафесій. На ўзроўні вышэйшай адукацыі сур'ёзна стаіць пытанне падрыхтоўкі кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі, практыка-арыентаваных спецыялістаў».

Па словах кіраўніка галіны, чырвонай ніткай праз усю сістэму адукацыі праходзяць пытанні выхавання патрыётаў нашай краіны. Асаблівы імпульс выхаванню дзяцей і моладзі павінны надаць мерапрыемствы, прысвечаныя Году гістарычнай памяці. **Гэта тэматыка павінна праходзіць чырвонай ніткай праз кожны ўрок, кожную лекцыю або выхаваўчае мерапрыемства ў сістэме адукацыі.** І асабліва роля ў вырашэнні гэтай задачы адводзіцца дысцыплінам сацыяльна-гуманітарнага блоку.

Міністр адукацыі паведаміў, што праектам новай Канцэпцыі аптымізацыі зместу, структуры і аб'ёму сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ва ўстановах вышэйшай адукацыі прадугледжана вывучэнне ўсімі студэнтамі ўстаноў вышэйшай адукацыі новай інтэграванай навучальнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці». Яе змест дазволіць праз прызму гістарычнага кантэксту сфарміраваць цэласнае ўспрыманне беларускай дзяржаўнасці ва ўсіх яе праявах.

«Таксама ў адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта арганізавана распрацоўка новай вучэбнай праграмы для ўсіх узроўняў асноўнай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа» і падрыхтоўка падручніка па дадзенай дысцыпліне. Пераканаць, што вывучэнне абноўленай дысцыпліны акажа значны ўплыў на фарміраванне ў вучняў грамадска-палітычнай пазіцыі ў адносінах да падзей і вынікаў Вялікай Айчыннай вайны, фундаментальных каштоўнасцяў грамадства, захавання гістарычнай памяці», — адзначыў Андрэй Іванец.

Яшчэ адзін важны напрамак работы — развіццё вузаўскай гістарычнай навукі. «Хачу адзначыць, што гістарычная тэматыка цяпер набывае выключнае значэнне ў сферы інфармацыйна-псіхалагічнага знешняга ўздзеяння на беларускае грамадства і асабліва на моладзь. Сёння скажэнні гістарычнага мінулага беларускага народа актыўна выкарыстоўваюцца пэўнымі дзеячамі, ангажаванымі СМІ і інтэрнэт-рэсурсамі ў мэтах маніпулявання ацэнкамі мінулага для нагнятання супрацьстаяння ў грамадскай свядомасці. На мой погляд, эфектыўнай прышчэпкай супраць такога роду дэструктыўнай дзейнасці з'яўляецца шырокае ўцягванне студэнцкай моладзі ў правядзенне навукова-даследчых работ па такіх дыскусійных тэматыках. Толькі абапіраючыся на глыбокае самастойнае вывучэнне гістарычнай праблемы, выкарыстоўваючы факталагічны матэрыял, малады чалавек зможа сфарміраваць аб'ектыўнае разуменне ролі гістарычнай падзеі ў працэсе станаўлення беларускай дзяржаўнасці», — падкрэсліў у сваім выступленні міністр.

Закранаючы абітурыенцкую тэму, Андрэй Іванец нагадаў усім прысутным, што, згодна з новай рэдакцыяй Кодэкса аб адукацыі, цяпер знятыя абмежаванні на месца знаходжання арганізацый — заказчыкаў кадраў. А, згодна з новымі правіламі прыёму ва ўстановы вышэйшай адукацыі, з 2023 года павялічваюцца аб'ёмы мэтавай падрыхтоўкі, з'яўляецца магчымасць залічэння па выніках універсітэцкіх алімпіяд і многае іншае. «Нам усім ужо зараз неабходна пачынаць самую актыўную работу з будучымі абітурыентамі, каб мэтавы набор у 2023 годзе быў выкананы на 100 працэнтаў. Часу на прамаруджванне ў нас проста няма», — падкрэсліў міністр.

Паводле яго слоў, яшчэ адна праблема, вырашэнне якой ляжыць на плячах у першую чаргу рэктараў, — гэта ўмацаванне кадравага складу ВНУ. «Цяпер прымаюцца меры па амаладжэнні і павышэнні якасці прафесарска-выкладчыцкага складу. Але відавочна, што гэтых намаганняў недастаткова. У ВНУ ўсё яшчэ назіраюцца пэўныя цяжкасці, звязаныя з прыцягненнем і замацаваннем маладых вучоных, якія так патрэбныя на выкладчыцкай рабоце, — адзначыў кіраўнік галіны. — Але важна, каб гэтая падрыхтоўка мела вынік — абарону дысертацый. Нам патрэбны не проста прапрацаваныя тэмы, а новыя методыкі, новая прадукцыя, прарыўныя тэхналогіі. І, вядома, яшчэ раз паўтару, нам патрэбны таленавітыя выкладчыкі, кандыдаты і дактары навук. Праца з маладымі вучонымі патрабуе сістэмнай перазагрузкі».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**по объекту**
**«Жилая застройка со встроенными помещениями общественного назначения в границах пр-т Дзержинского – ул. Щорса – ул. Папанина»**
**(1-я очередь строительства)**

**Застройщик:** общество с ограниченной ответственностью «ДАТЧ СТАР» зарегистрировано Минским горисполкомом 09.09.2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191061436.

**Местонахождение:** Республика Беларусь, 220069, г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 860. Тел. 375 (17) 336 73 88, 375 (44) 5343000, 375 (29) 5343000

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 19.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

**Реализованные проекты:** «Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генплану в квартале пр-т Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения в г. Минске (I, II, III очереди строительства).

**Информация о проекте строительства**

**Цель строительства** – строительство «Жилая застройка со встроенными помещениями общественного назначения в границах пр-т Дзержинского – ул. Щорса – ул. Папанина (1-я очередь строительства).

Строительство осуществляется с выделением пусковых комплексов:

1 пусковой – жилая часть жилого дома № 1,

2 пусковой – встроенные помещения общественного назначения жилого дома № 1,

3 пусковой – подземный гараж-стоянка № 5.1 (встроенный).

Начало строительства – 06.01.2022 года, предполагаемый срок ввода в эксплуатацию – 21.07.2023 года.

**Застройщиком получены:**

- решение Минского городского исполнительного комитета № 3893 от 30.12.2021 г. об изъятии и предоставлении земельных участков;
- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации земельного участка и возникновении права на него от 06.01.2022 г. № 500/1719-13158;
- заключение государственной экспертизы № 514-15/21 от 04.11.2021 (положительное);
- извещения о получении уведомления о производстве строительно-монтажных работ и регистрации объекта строительства органами государственного строительного надзора № 2-203Ж-001/22 от 10 января 2022 года;
- договора строительного подряда от 3 января 2022 г. № 05-01/2022.

**Информация об объекте**

Жилая застройка расположена в границах пр-т Дзержинского – ул. Щорса – ул. Папанина. Проектом предусматривается строительство 143 квартир в односекционном жилом доме высотой 20 этажей, со встроенными объектами обслуживания населения на первом этаже, с одноуровневой подземной гараж-стоянкой. В доме запроектированы однокомнатные и двухкомнатные квартиры, на 19–20 этажах двухуровневые двухкомнатные квартиры. Принята конструктивная схема с монолитным каркасом с заполнением наружных стен блоками со сплошным утеплением минераловатными плитами, межквартирные и межкомнатные перегородки из блоков. Наружная отделка – декоративная штукатурка с последующей покраской, вентилируемый фасад с облицовкой керамогранитной плиткой. Окна – профиль ПВХ, заполнение – двухкамерные стеклопакеты с детскими замками безопасности. Остекление лоджий, балконов – профиль ПВХ. Жилой дом оборудован 2 лифтами. В квартирах выполнена штукатурка стен, цементно-песчаная стяжка, розетка для электроплиты, установка унитаза в с/у.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности, после ввода в эксплуатацию жилого дома и передаче дольщикам объектов долевого строительства, входят:

помещения инженерного назначения; межквартирные лестничные клетки, лифтовые холлы, вестибюли, лифты, конструкции дома, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства, помещение товарищества собственников.

В элементы благоустройства и озеленения проектом предусматривается устройство тротуаров, пешеходных дорожек, размещение площадки для сбора мусора, устройство газонов, посадка деревьев и кустарников.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

**4 (четыре)** однокомнатные квартиры **площадью от 40,1 до 71,34 кв. м:** стоимость 1 кв. метра **от 3 450 до 3 870 белорусских рублей**.

**3 (три)** двухкомнатные квартиры **площадью от 79,37 до 98,08 кв. м:** стоимость 1 кв. метра **от 3 240 до 3 630 белорусских рублей**.

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади и условий оплаты строящегося жилого дома.

Оплата производится в белорусских рублях. Данные цены действуют до момента опубликования новой проектной декларации и при условии наличия данных квартир, предложенных для заключения по договорам создания объектов долевого строительства.

**Условия оплаты** – оплата полной цены договора в течение 5 календарных дней с момента регистрации договора долевого строительства в Комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома.

Ознакомление дольщиков с планировками квартир, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется по предварительной договоренности в рабочее время ООО «ДАТЧ СТАР» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 860. Тел. 375 (17) 336 73 88, 375 (44) 5343000, 375 (29) 5343000.

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ ООО «НикаПроект»,

**опубликованную в газете «Минский курьер» 22.01.2021 г.**

по объекту **«Многокварти́рный жилой дом со встроенными помещениями на пересечении ул. Прилукской — ул. Глаголева — пр-т Жукова» (2-я очередь строительства)**

(2-я секция)

**Характеристика объекта строительства:** проектной документацией предусматривается в том числе строительство трех встроенных нежилых помещений общей площадью 221,48 кв. м, 72,28 кв. м, 131,11 кв. м с обособленными входами для каждого помещения непосредственно с улицы с дворовой территории.

Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагаются офисные помещения по цене за 1 кв. м, эквивалентной 1 600,00 долларов США.

**Условия оплаты:** оплата 100 % стоимости объекта долевого строительства в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном и распорядительном органе. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа. По соглашению сторон дольщику могут быть предоставлены скидки от общей стоимости объекта, либо иные условия его оплаты.

УНП 191581623

**Утерянное свидетельство о государственной регистрации ЧТУП «СУРОБ» УНП 691574094, и Устав ЧТУП «СУРОБ» считать недействительными.**

Сямейная газета

Выпуск № 4 (186)

# КАМЕНЬ НА ПАЛІЦЫ

*Дзімкавы бацькі вырашылі жыць паасобку. Хлопчыка з-за гэтага давялося пераводзіць у іншы дзіцячы садок. Не так даўно я абедала з яго мамай. Пад канец нашай сустрэчы Дзімку з прагулкі прывёў тата і на развітанне сказаў: «Сына, калі цябе ў садку будзе хтосьці крыўдзіць, не бойся, давай здачы! Бі ў адказ, як я цябе вучыў». — «Тата, а словамі можна?» — да глыбіні душы ўзрушыла мяне мудрасць пяцігадовага хлопчыка.*

*Калі я сустракаю людзей, якія пераканаць, што сіла вырашае ўсё, чамусьці ўяўляю іх маленькімі і бездапаможнымі. Накшталт сына святара, пра якога ў 1978 годзе падчас свайго выступлення на тэму гвалту распавядала пісьменніца Астрыд Ліндгрэн.*

*Жонка святара, веруючая жанчына, як толькі нарадзіла першае дзіцятка, прыняла рашэнне ніколі не падымаць на яго руку. Хоць пакаранне розгамі з мэтай выхавання ў той час было вельмі распаўсюджаным. Але аднойчы, калі хлопчыку было чатыры ці пяць гадоў, ён учыніў нейкае свавольства. Жанчына святара не ўтрымалася і ўпершыню ў жыцці вырашыла паступіцца сваімі прынцыпамі. Яна сказала сыну, каб той пайшоў у двор і сам знайшоў для сябе дубец. Хлопчыка доўга не было, а калі ён вярнуўся, твар яго быў мокры ад слёз. «Мама, я не знайшоў дубец, але знайшоў камень, якім ты можаш у мяне кінуць». У гэты момант жанчына ўбачыла сітуацыю вачыма дзіцяці: «Калі мая мама хоча зрабіць мне балюча, то няма ніякай розніцы, як яна гэта зробіць». Жонка святара пасадзіла сына на калені і яны разам паплакалі. А потым паклалі камень на кухонную паліцу як напамін пра галоўнае.*

*«Нашы дзеці глядзяць тэлевізар, яны бачаць, як шмат на зямлі агрэсіі, і, магчыма, лічаць, што гэта адзіны спосаб вырашыць усе праблемы. Але мы, бацькі, акурат зараз, у сваім доме, можам паказаць ім, што ёсць іншы шлях. І гэта тое, што мы можам зрабіць дзеля міру. Усім нам не перашкодзіць камень на кухоннай паліцы!» — рэзюмавала Астрыд Ліндгрэн.*

*...Мне ў дзяцінстве часам перападала ад таты. Таму я гэтаксама, як і жонка святара, цвёрда для сябе вырашыла, нягледзячы ні на што, не караць свайго сына фізічна. Дарэчы, што датычыцца выхавання, мне імпануе «тыбецкі погляд». Трапіла на яго яшчэ падчас цяжарнасці і нават замалявала сабе схемку ў нататнік.*

*Згодна з тыбецкай сістэмай выхавання, да пяці гадоў з дзіцем трэба абыходзіцца «як з царом». Нельга яму штосьці забараняць і тым больш караць. Калі яно робіць штосьці няправільнае ці небяспечнае, трэба зрабіць спужаны выгляд і пераключыць яго ўвагу на штосьці іншае. Калі ж у гэтым узросце залішне аберагаць дзіця і многае яму забараняць, у выніку не атрымаецца нічога добрага. Вы проста прыгнецяце яго жыццёвую актыўнасць і навучыце бяздумна падпарадкоўвацца.*

*З пяці да дзесяці гадоў абыходзьцеся з дзіцем «як з рабом», але, вядома, без жорсткасці. У гэты час важна ставіць перад ім розныя задачы, кантраляваць, як яны выконваюцца, і навучыць сваю крывіначку быць гатовым да наступстваў, якія вынікаюць з-за іх невыканання. Так маленькі чалавек вучыцца несці адказнасць за свае ўчынкі, імкнуцца да станоўчых рэчаў і пазбягаць адмоўных. Калі ж у гэты перыяд працягваць ставіцца да дзіцяці «як да караля», яно вырасце інфантыльным, не навучыцца адказваць за свае ўчынкі і не будзе здольнае да працы.*

*З дзесяці да пятнаццаці гадоў абыходзьцеся з дзіцем «як з роўным». Райцеся, пытайцеся яго меркавання, заахвочвайце самастойнасць. Калі вы будзеце ўсё забараняць, то адносіны толькі пагоршацца, і дзіця можа трапіць у небяспечную сітуацыю. А калі празмерна аберагаць, то яно вырасце няўпэўненым у сабе і залежным ад чужога меркавання.*

*З пятнаццаці гадоў важна ставіцца да свайго дзіцяці з павагай. Даваць парады, але не выхоўваць. І калі вы да гэтага рабілі ўсё правільна, то пабачыце, што дзіця ператварылася ў самадастатковую, паўнавартасную асобу, якая паважае сябе, сваіх бацькоў і навакольных. І разумее, што яе правы заканчваюцца там, дзе пачынаецца боль іншага чалавека.*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Тыя, хто побач

Уладзімір і Таццяна РАДЗІВІЛАВЫ

# «Без кахання няма шчасця»

**Шырыню творчага таленту Уладзіміра Радзівілава цяжка вымераць у пэўных сістэмах. Дзеці яго ведаюць як галоўнага Дзеда Мароза краіны, без якога цяжка ўявіць беларускі Новы год. Дарослыя хоць бы раз бачылі яго выступленні на шматлікіх канцэртах і фестывалях, чыталі інтэрв'ю. Шчырае абаянне і адметныя творчыя здольнасці, якія выдатна праяўляюцца ў розных іпастасях, ужо колькі гадоў запар прыводзяць публіку на выступленні заслужанага артыста Беларусі Уладзіміра Радзівіліва. Але што застаецца за кулісамі?**

У творчым арсенале артыста размоўнага жанру, парадыста, канферансье шмат анекдотаў. У тым ліку і пра жанчын. «Мужчына прыходзіць дадому ў тры гадзіны ночы. Адчыняе дзверы, а там жонка з качалкай стаіць. Ён на яе глядзіць, уздыхае і кажа: «А ты ўсё пячэш!», — усміхаецца Уладзімір Генадзьевіч. І адразу дадае, ужо сур'ёзна: «Жанчына — гэта адна з самых любімых, чароўных, абаяльных фігур у жыцці мужчын. Калі б не было жанчын, не было б нас. Калі б не было нас, не было б жанчын. Жаночыя абаянне, логіка, мысленне, жаночыя пачуцці даюць нам сілу. Мая жонка выхавала мяне як артыста. Усе мае ўзнагароды — і яе дасягненне таксама».

Акрамя ўсіх творчых поспехаў, Уладзімір Радзівілаў можа ганарыцца яшчэ адным — сваёй моцнай сям'ёй. Разам з жонкай Таццянай яны ўсё робяць разам: адпачываюць, працуюць ва ўжо роднай Беларускай дзяржаўнай філармоніі, вырошчваюць ружы, выхоўваюць кошку, даюць інтэрв'ю. Пра сакрэты свайго сямейнага шчасця Таццяна і Уладзімір Радзівілавы расказалі «Сямейнай газеце».

## САКРЭТ ПЕРШЫ. МЫ ЗАЎСЁДЫ РАЗАМ

«Мы ўсё жыццё разам. У школе вучыліся разам. Я служыў у войску ў Бабруйску, яна ў гэтым горадзе вучылася і прыходзіла да мяне на танцы. Мы разам пераехалі ў Мінск. Я паступіў у музычнае вучылішча імя Глінкі, яна — у эканамічны ўніверсітэт...

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Нататкі навaспечаных вяскоўцаў

# НАСЕННЕ З ГІСТОРЫЯЙ

**Ледзь толькі з нашага агародзіка сышоў снег і ў паветры запахла вясной, я адразу ж пачала разбіраць свае запасы насення. А іх, як аказалася, з камарыны нос. Пакуначкі з выявай кавуна і салатнай сумессю «Фітнес» ад сябра з Масквы. Семечкі дэкаратыўных сланечнікаў ад суседкі Святланы. Лекавы рамонак ад хрэсніцы і добрая жменя кропу, клапатліва сабраная мамай. З такімі запасамі далёка не даедзеш, таму я сур'ёзна задумалася аб тым, дзе і якім насеннем разжыцца.**

Якраз у гэты час пісала матэрыял пра гаспадыню аграсядзібы з Палесся. Як аказалася, Настасся Цяслюк ужо не першы год рассылае па пошце ўсім ахвотным чысцюткае (не апрацоўвалася хімікатамі і пестыцыдамі) насенне гародніны, кветак, прыпраў, лекавых раслін. Збіраюць яго летам і ўвосень бабулькі вёскі Хваенск і іх сваячкі, жанчыны якія жывуць у Давыд-Гарадку. Робяць яны гэта так даўно, колькі сябе памятаюць. Іх мамы так рабілі. І бабулі.

Мяне так натхніла думка, што сёлета на маім агародзіку з'явіцца кавалачак Палесся, што, не раздумваючы, заказала сабе наборчык насення з сямейнымі гісторыямі.

Што ж я сёлета буду садзіць на градках і чаму? Вырашыла не распыляцца і спыніцца на трох кітах. Першы кіт: ЗЕЛЯНІНА. Мы яе любім ды шмат ужываем, таму вельмі зручна, каб яна заўсёды была пад рукой. Сярод маіх фаварытаў: рукала, шпінат, кроп, цыбуля, лісце салаты, базілік, радыс і спаржавая фасоля (я гэта таксама да зеляніны адношу). Прычым сею зеляніну за сезон часта: пакуль адну партыю ядзім, другая расце. Другі кіт: БУЛЬБА. Я бульбаш як ні круці. Праўда, сёлета пасадзім усяго траціну кошыка. Гэтага нам хопіць, каб паесці свежанькай бульбачкі, бо, пакуль не пабудавалі склеп, няма дзе захоўваць вялікі ўраджай.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «СГ».)*

Новае ў адукацыі

# НАВОШТА ШКОЛЬНІКАМ МЕДЫЯЦЫЯ?

## Вучыць бесканфліктным стасункам і пазітыўнай камунікацыі

**Расказваць школьнікам пра магчымасці мірнага спосабу вырашэння канфліктаў спецыялісты пачалі ў 2016 годзе, калі ў школах сталі стварацца дзіцячую службу медыяцыі. Вучні, узброеныя ведамі, якімі валодае медыятар, вучыліся самі вырашаць свае ўнутрышкольныя непаразуменні і станавіліся медыятарамі. З часам медыяцыя пачала развівацца не толькі ў школах, але і ў каледжах і ВНУ. Цяпер ужо можна казаць, што школьная медыяцыя вырасла з першапачатковых рамак і стала медыяцыяй у сістэме адукацыі. Ужо распрацавана канцэпцыя аб развіцці медыяцыі ў сістэме адукацыі да 2025 года, дзе гаворка ідзе пра важнасць медыяцыі для адукацыйных устаноў і пазначаны напрамкі, як яна можа развівацца. А сёлета ў пяты раз пройдзе фестываль «Медыяцыя будучыні для школьнікаў і студэнтаў», паведаміла Ірына АРЛОЎСКАЯ, намеснік дырэктара Цэнтра «Медыяцыя і права», якая расказала пра дасягненні і развіццё школьнай медыяцыі.**

### СЛУЖБЫ І ФАКУЛЬТАТЫВЫ

Спачатку праект стартаваў у некаторых школах Мінска і крыху закрануў сярэднія навучальныя ўстановы Гродна. Цяпер жа ён актыўна дзейнічае ў сталіцы і Мінскай вобласці, Гомелі, Гродне, Віцебску і абласцях, нядаўна пачалі далучацца Брэст і вобласць, заўважыла яна:

**Нельга забывацца, што медыяцыя — добраахвотная працэдура, і задача следчага — расказаць, што бакі канфлікту могуць звярнуцца да гэтай працэдуры.**

— У навучальных установах ствараюцца як службы, дзе разам вырашаюць спрэчкі вучні і педагогі, так і факультатывы, якія асабліва актыўна развіваюцца ў каледжах. На гэтыя заняткі па навыкі бесканфліктных зносін, пазітыўнай камунікацыі і вырашэння канфліктаў мірным шляхам школьнікі прыходзяць па жаданні. На такіх дадатковых занятках яны не становяцца юнымі медыятарамі і не атрымліваюць адпаведных пасведчанняў, што мы выдавалі вучням, калі пачыналі праект і праводзілі трохмесячнае інтэнсіўнае навучанне. Аднак праграма факультатываў максімальна набліжана да ведаў, якія атрымлівалі першыя школьнікі-медыятары.

У пачатку праграмы школьнай медыяцыі да праекта далучыўся педагагічны каледж, выпускнікі якога цяпер ужо працуюць у школах ды садках і прымяняюць навыкі бесканфліктных стасункаў на практыцы. Факультатыў па медыяцыі актыўна працуе таксама і ў юрыдычным каледжы.

— Хоць у каледжах не створаны службы медыяцыі як такія, яны актыўна звяртаюцца да нас у цэнтр ці школы або ВНУ, дзе створаны службы медыяцыі, па вырашэнне канфлікту, — дадала Ірына Арлоўская. — Калі мы спачатку прыйшлі ў школы, то думалі, што будзем займацца канфліктамі, якія ўзнікаюць унутры школы паміж дзецьмі, бацькамі. Аднак не кожная школа сёння гатовая стварыць сваю службу, таму мы працуем над выбудоўваннем сістэмы, або можна звярнуцца дзецям з установы, дзе ёсць служба медыяцыі, у суседнюю — дзе яе няма.

Важна, каб службы школьнай медыяцыі працавалі з дзецьмі, педагогамі, бацькамі, каб заўважалі нават маленькія канфлікты. Складаныя праблемы, як правіла, вырастаюць з дробных і незаўважных праяў, якія, здаецца, адбыліся і забыліся. Аднак засталося пачуццё крыўды ці недаверу, якое з часам можа прывесці да больш сур'ёзных праблем. Таму неабходна ўмець заўважаць дробязі і разбіраць іх у самым пачатку, перакананая эксперт.

### КРЫМІНАЛЬНЫ КАНФЛІКТ І АДНАЎЛЕНЧЫЯ ПРАКТЫКІ

Медыятары цяпер выйшлі за межы чыста школьнага канфлікту. Яны працуюць з праявамі, якія часта маюць крымінальны характар. З-за няведання, праз юнацкі максімалізм або пад уплывам кампаній ці сацсетак падлеткі здзяйсняюць учынкі, якія маюць крымінальныя наступствы. Хоць яны яшчэ не падлягаюць крымінальнай адказнасці. Паўстала праблема, што падобныя канфлікты не могуць разбіраць дзеці-медыятары — з такімі праблемамі павінны працаваць прафесійныя медыятары, бо тыя маюць прававыя наступствы.

**У любым канфлікце не бывае невінаватых і вінаватых. Ёсць бакі, дзеянні якіх прывялі да стварэння канфлікту, так што ў працэсе паўдзельнічаў кожны.**

— Сёння мы працуем не проста з канфліктам, у межах якога можа быць заключаны нейкі медыяцыйны дагавор. Мы працуем па аднаўленчай праграме, калі справа не абмяжоўваецца толькі паміж непаўналетнім, які здзейсніў правапарушэнне, і тым, хто ад яго пацярпеў. Да разгляду далучаюцца педагогі, класны кіраўнік, бацькі і сам клас. Такім чынам, ідзе работа з групавым канфліктам, а не класічная медыяцыя, дзе два бакі заключаюць пагадненне і разыходзяцца. У гэтым выпадку мала знайсці прымальнае для ўсіх рашэнне — неабходна ўвесці дзяцей у калектыў класа, які ўспрымаў іх як удзельнікаў канфлікту. Для гэтага мы выкарыстоўваем тэхнікі аднаўленчай медыяцыі — колы, працуючы з усёй групай. Мы бачым, што мала прагаварыць і абазначыць нейкія правілы паводзін у пэўным калектыве. Часта ўзнікаюць запыты, як спраўляцца, напрыклад, з маніпуляцыяй, — падзялілася медыятар.

Летась у крымінальнае заканадаўства сярод іншых змяненняў было ўнесена паняцце медыяцыі, і для дзяцей медыяцыя ў крымінальным працэсе вельмі неабходная. Аднак застаецца шмат пытанняў, як яна будзе працаваць у дадзенай сферы. Таму варта было б ладзіць дыялогавыя пляцоўкі, дзе прадстаўнікі ўсіх дзяржорганаў і прафесійныя медыятары будуць выпрацоўваць алгарытм укаранення механізма медыяцыі ў крымінальны працэс, спадзяецца Ірына Арлоўская. У хуткім часе, напрыклад, адбудзецца форум медыяцыі.

**Складаныя праблемы, як правіла, вырастаюць з дробных і незаўважных праяў, якія, здаецца, адбыліся і забыліся. Аднак засталося пачуццё крыўды ці недаверу, якое з часам можа прывесці да больш сур'ёзных праблем.**

Са здарэннямі крымінальнага характару сярод непаўналетніх медыятары працавалі і да прыняцця змяненняў у закон. Усяго па краіне такіх выпадкаў каля пары дзясяткаў, і кожны з іх меў станоўчы вынік для дзіцяці і бацькоў, падзялілася медыятар:

— Нядаўна разглядалі справу, калі падлетка ледзьве не адправілі ў калонію за частыя і цяжкія бойкі. Аднак да разгляду канфлікту далучыліся бацькі, школа, і дзіця адчула сябе патрэбным. У выніку падлетак стаў мяняцца, і неабходнасць у абмежаванні яго волі знікла. А быў выпадак, калі адзін з удзельнікаў бойкі ўпаў у кому, і разгляд той справы таксама меў станоўчы вынік. Калі разглядаюцца выпадкі булінгу, таксама задзейнічаюць аднаўленчыя практыкі. Выпрацоўваюць алгарытмы ўзаемадзеяння з пэўнай групай. Група выпрацоўвае правілы паводзін. Хоць іх складана выконваць, асабліва калі зашкальваюць эмоцыі, аднак трэба разбіраць такія выпадкі, бо гэта лёс дзіцяці.

Некаторыя прыходзілі нават са Следчага камітэта, калі ўжо ішоў судовы працэс. Медыятары працавалі з сям'ёй дзіцяці, каб аб'яднаць яе, бо бацькі часта не ведаюць, як падтрымаць малога, бо ім гэтак жа страшна, як і яму. Нельга забывацца, што медыяцыя — добраахвотная працэдура, і задача следчага — расказаць, што бакі канфлікту могуць звярнуцца да гэтай працэдуры. А калі дзіця здзейсніла крымінальны ўчынак, яно павінна ўсвядоміць, за што менавіта будзе несці адказнасць, а таксама прапанаваць варыянты выпраўлення сітуацыі і вырашэння праблемы.

### АБМЕН ВОПЫТАМ І ВЯРТАННЕ АДКАЗНАСЦІ

У межах канцэпцыі развіцця медыяцыі спецыялісты бачаць мэтазгодным стварэнне ў школах, каледжах, ВНУ службаў унутры. Вельмі часта медыяцыйная служба сутыкаецца з праблемай захавання канфідэнцыяльнасці і нейтральнасці. Гэтыя абавязковыя прынцыпы медыяцыі дазваляюць забяспечваць наяўнасць знешняга куратара. Унутраны куратар забяспечвае работу службы медыяцыі, інфармаванасць пра яе, а знешні (як правіла, гэта прафесійны медыятар) падключаецца да складаных выпадкаў, якія маюць крымінальны падтэкст.

— Навучаныя педагогі і школьнікі спраўляюцца, аднак для максімальнага нейтралітэту неабходны чалавек, які не працуе ўнутры школы, — падкрэсліла намеснік дырэктара.

**Варта было б ладзіць дыялогавыя пляцоўкі, дзе прадстаўнікі ўсіх дзяржорганаў і прафесійныя медыятары будуць выпрацоўваць алгарытм укаранення механізма медыяцыі ў крымінальны працэс.**

З фестывалю, што арганізоўвае цэнтр, нарадзілася навуковая канферэнцыя, дзе з работамі выступаюць не толькі студэнты і аспіранты, але і школьнікі. Акрамя таго, фестываль стаў пляцоўкай для абмену вопытам паміж юнымі медыятарамі з усёй краіны, а таксама Расіі, Казахстана.

— Мы запрашаем да ўдзелу прадстаўнікоў дзяржорганаў, якія вядуць дыялог не з намі, медыятарамі, а са школьнікамі, якія рыхтуюцца да гэтых мерапрыемстваў, выступаюць, — расказала Ірына Арлоўская. — Комплексны падыход вельмі важны, таму наша задача — запрашаць на мерапрыемствы не толькі спецыялістаў Мінадукацыі і дзяржорганаў, але і прадстаўнікоў інспекцый па справах непаўналетніх, камісій па справах непаўналетніх, органаў пракуратуры і Следчага камітэта. Калі мы ў будучым забяспечым міжведамасны падыход да сітуацый, у якія трапляюць падлеткі, мы створым для іх бяспечны буфер выхаду з таго асяроддзя, у якое яны трапілі, і сацыялізацыі ў грамадстве.

Медыяцыя — гэта не толькі прымірэнне і дамоўленасці, але і вяртанне адказнасці. Калі мы трапляем у канфлікт, то пачынаем шукаць доказы, што «я невінаваты», а медыяцыя дазваляе вярнуць гэтую адказнасць усім бакам у той меры, у якой яе неабходна адчуваць, у тым ліку і бацькам. Адказнасць за дзіця не канчаецца, калі яму спаўняецца 18 гадоў. Бацькі павінны забяспечваць дзіцяці надзейны тыл і пасля, прымаючы ўжо не такі актыўны ўдзел у яго жыцці, аднак не пакідаючы яго сам-насам з праблемамі, упэўненая спецыяліст:

— Толькі калі ты пачынаеш адчуваць сваю адказнасць, ты гатовы на нейкія крокі, каб выпрацаваць прымальнае для ўсіх рашэнне. У крымінальным канфлікце гэта будзе датычыцца прапаноў па загладжванні нанесенай шкоды. І часам гаворка ідзе найперш нават не пра матэрыяльны ўрон, а пра выбачэнне ў паважлівай ці публічнай форме.

Так ці інакш варта памятаць, што ў любым канфлікце не бывае невінаватых і вінаватых. Ёсць бакі, дзеянні якіх прывялі да стварэння канфлікту, так што ў працэсе паўдзельнічаў кожны. Зразумець гэта, прыняць, усвядоміць і выпрацаваць прымальныя для ўсіх рашэнні — і ёсць сутнасць працэдуры медыяцыі.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

# «БЕЗ КАХАННЯ НЯМА ШЧАСЦЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Пасля арміі я працаваў ва Уздзе на аўтабазе і неяк сказаў, што хачу паспрабаваць паступіць у музычнае вучылішча. Таня падтрымала, з гэтага ўсё і пачалося. А так, магчыма б, і працаваў на аўтабазе», — расказвае Уладзімір Генадзьевіч.

«Я бачыла, што ёсць талент, ёсць голас. Нельга было ўсё гэта страціць, трэба было развівацца», — дадае Таццяна Аляксандраўна.

Затым была чарада гарадоў і калектываў: Усерасійская творчая майстэрня эстраднага мастацтва ў Маскве, Беларускі ўніверсітэт культуры, калектыў Ядвігі Паплаўскай і Аляксандра Ціхановіча, «Сябры». А затым пара замацавалася ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Жонкі артыстаў, як і жонкі ваенных, — усюды за мужам. А як інакш, калі жонка — і муза, і галоўная падтрымка, і крытык, і канцэртны дырэктар.

«Пасля інстытута ў мяне было сваё швейнае атэлье. Я працавала там, але займалася і пытаннямі арганізацыі выступленняў Уладзіміра. Журналісты, арганізатары, аўтары — усе тэлефанавалі мне. Быў адзін канцэртны дырэктар, але першы ганарар атрымаў і знік. І я, працуючы ў сваім атэлье, вяла ўсю адміністрацыйную работу па канцэртнай дзейнасці. А ў мяне ж свае справы, падначаленыя, адказнасць. І мы вырашылі, што атэлье я прадам і перайду ў канцэртны аддзел філармоніі, каб афіцыйна быць канцэртным дырэктарам Уладзіміра. Тым больш часта ўдзельнічаем у мерапрыемствах высокага ўзроўню, трэба ўважліва ўсё рабіць. Вучылася ў калег, удасканальвала навыкі. У артыстаў на сцэне свая справа, у нас за кулісамі — свая. А калі Уладзімір працуе як галоўны Дзед Мароз краіны, то я і касцюмер, і грымёр, і дырэктар», — расказвае Таццяна Аляксандраўна. Яна яшчэ і галоўны крытык. Перш чым Уладзімір Генадзьевіч прадставіць новы матэрыял публіцы, прадстаўляе яго жонцы. Яна, калі патрэбна, рэдагуе і ацэньвае як глядач. Маналогі Уладзіміру Радзівілаву пішуць многія аўтары, і ўсе яны праходзяць праз «кастынг» Таццяны Радзівілавай.

«Калі я сам нешта пішу, Таццяна — мой галоўны куратар і крытык. Яна праверыць кожную памылку, націск у кожным слове. Яна нават дапамагае мне на сцэне. На адным з канцэртаў я пачаў расказваць свой маналог пра жанчын. І заблытаўся ў думках, неяк не туды мяне занесла. Таццяна з-за куліс падказала. І адной фразы хапіла, каб вярнуцца ў патрэбнае рэчышча», — расказвае Уладзімір Генадзьевіч.

Летам Таццяна і Уладзімір Радзівілавы адзначаць 35-ю гадавіну сямейнага жыцця. Яны кажуць, што пастаянна быць разам — гэта выдатна і зусім не надакучвае. Тым больш і сябры ў пары такія ж сямейныя доўгажыхары.

«Да пандэміі мы часта разам сустракаліся ў нас на дачы, адпачывалі. Рабілі шашлыкі, спявалі песні пад гітару. Мы такая беларуска-савецкая музычная сям'я», — жартуе Уладзімір Радзівілаў.

Дарэчы, іх дача — яшчэ адзін элемент сакрэту сямейнага жыцця.

## Сакрэт другі. Кветкі і каты

Аб'ядноўвае Таццяну Аляксандраўну і Уладзіміра Генадзьевіча любоў да катоў і кветак. Цэлых 25 гадоў у сям'і жыў камышовы кот Цімафей Маркізавіч. Усе разам ездзілі на гастролі і ў адпачынак. Гадаванец так моцна любіў сваіх гаспадароў, што часовых «нянек» не прызнаваў. Ну, гаспадары і не былі супраць. Сапраўды, без ката і жыццё — нуда. Цяпер «тое жыццё» ў сям'і Радзівілавых стварае кошка Рыжэна.

«Рыжэна вельмі цікавая. Таня — яе найлепшая сяброўка. А са мной яна любіць гуляць, асабліва ў хованкі. Я яе навучыў мяўкаць у адказ на мае словы, і мы можам з ёй весці размовы. Пасля Цімафея Маркізавіча мы не хацелі браць ката. Дачная кошка Машка нарадзіла кацянят ад суседа. Мы вырашылі іх пакінуць на дачы, але адно кацяня само села да нас у машыну. Мы здаліся і забралі яе дадому, дзе тая адразу адчула сябе гаспадыняй», — расказвае Уладзімір Генадзьевіч.

Гаспадыняй Рыжэна сябе адчувае і на лецішчы, сярод плантацый кветак. Уладзімір Радзівілаў вядомы аматар ружаў. І не толькі таму, што артысту іх часта і шмат дораць пасля канцэртаў. Ён любіць іх вырошчваць. На сядзібе расце некалькі відаў кветак. «Кусты ружаў засталіся ад папярэдняй гаспадыні, у якой мы купілі дачу. І я ў іх закахаўся. Потым суседка падарыла два кусты, потым яшчэ дарылі. Але як я ружы люблю, так я ад іх і плачу. Яны заўсёды колюць мне пальцы. Заўсёды. Нават калі на канцэртах дораць букеты, абавязкова ўкалюся. За ружамі трэба ўважліва сачыць. Вось зараз некалькі вымерзла, хоць я іх захутаваў. А тая, якой сказаў: «Расці, як хочаш!» і не закутваў, зіму вытрымала. Капрызныя кветкі, але ж любімыя», — прызнаецца Уладзімір Генадзьевіч.

Таццяна Аляксандраўна на ружах не спыняецца і засаджвае дачную сядзібу рознымі кветкамі. Каб вока радавалася. Аднак не ўсё так прыгожа ў гэтай дачнай гісторыі. «Стараюся жонцы не трапляцца на вочы з рыдлёўкай. Інакш паўдня капаю агарод», — жартуе Уладзімір Генадзьевіч.

Акрамя працы на сцэне і на зямлі артыст цудоўна адчувае сябе і на кухні, асабліва любіць гатаваць мяса. І нават дзеліцца сваім фірменным рэцэптам: «Свініну ці курынае філе рэжам на кавалкі і кладзём у рондаль. Туды ж дадаем цыбулю, моркву, спецыі — хто якія любіць. Заліваем вадой, каб пакрыць мяса, і ставім тушыцца. Падаваць яго трэба з варанай бульбай». Эфектыўнае раздзяленне абавязкаў — яшчэ адзін сакрэт сямейнага шчасця.

## Сакрэт трэці. Запавет ад майстра

На шчаслівае сямейнае жыццё Радзівілавых блаславіў сам Уладзімір Мулявін. «Мы былі ў добрых адносінах. Я нейкі час працаваў з «Песнярамі». Аднойчы прынёс Уладзіміру Георгіевічу дзве свае пародыі на яго, каб ён выбраў, якую мне выконваць. Я нават хацеў у «Песняры» праслухацца, але Уладзімір Рыгоравіч сказаў, што ў мяне свой шлях», — успамінае

Уладзімір Генадзьевіч. Як аказалася, мэтр меў рацыю.

«А мне Мулявін наказаў, каб я берагла мужа, бо ў яго талент. На ўсё жыццё гэта запомніла», — дадае Таццяна Аляксандраўна.

## Сакрэт чацвёрты. Адпавядаць уяўленням

«О, жанчына, як шмат у гэтым слове дабрыні, любові і прыгажосці! Я вельмі цаню, калі жанчына добрая і спагадлівая. Самае галоўнае ў жанчыне — гэта дабрыня і ўменне выслухаць і зразумець. І кулінарныя навыкі, бо шлях да сэрца мужчыны ляжыць праз яго страўнік», — расказвае Уладзімір Радзівілаў пра якасці, якія найбольш цэняць у жанчынах. Дарэчы, сярод усіх гістарычных асоб ён вылучае Марыю Магдаліну. Па яго словах, яна — увасабленне дабрадзейнасці, любові і зачаравання.

Таццяна Аляксандраўна галоўнымі якасцямі ў мужчыне называе надзейнасць: «Каб можна было даверыць сваю любую праблему, сумненні. Каб можна было заўсёды параіцца і адчуць узаемны кантакт».

## Сакрэт пяты. Няма ніякіх сакрэтаў

Два слупы, на якіх, па меркаванні Уладзіміра Радзівілава, стаіць сямейная гармонія, гэта давер і любоў. «Мы заўсёды давяраем адно аднаму. Самае галоўнае — гэта любіць, давяраць і разумець. Гэта этыкет сямейнага жыцця, і кожны павінен яго выконваць. Думаю, калі б мы не любілі адно аднаго, то даўно б разышліся. Але мы разам і заўсёды разам. Без кахання няма шчасця. Без кахання няма той аддачы, якая павінна быць у пары. Калі два чалавекі шчыра кахаюць, гэта гаворыць аб тым, што гэта сапраўдная, прыгожая, мудрая сям'я».

Таццяна Радзівілава дадае, што ў пары абавязкова павінен быць агульны інтарэс. Ім абавязкова павінна быць цікава ўдваіх, тады і дыхаць лягчэй (вяртаемся да сакрэту нумар два і ўспамінаем катоў і кветкі).

А яшчэ сям'я Радзівілавых — яркі прыклад таго, што супрацьлегласці прыцягваюцца. «Я спакойны казярог. Мяне вельмі цяжка вывесці з сябе. А Уладзімір, наадварот, запальчывы, але хутка адыходзіць. Я ўжо часам і не рэагую, калі ён узгарыцца чарговы раз. Так і падстройваемся адно пад аднаго», — усміхаецца Таццяна Аляксандраўна.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### Нашы думкі звернутыя да вас пастаянна

«Мая жанчына — мой тыл. Мая крэпасць і мая любоў», — кажа Уладзімір Радзівілаў. Ён раіць усім мужчынам казаць прыемныя словы сваім каханым не толькі ў святочныя дні. А ўсіх жанчын віншуе з надыходзячым 8 Сакавіка: «Хтосьці сказаў, што мужчыны ўспамінаюць пра жанчын толькі 8 Сакавіка. Гэта няпраўда. Нашы думкі звернутыя да вас пастаянна. Думкі, поўныя любові, пяшчоты, клопату і ўвагі. Мы гатовы ісці за вамі, дарагія жанчыны, на край свету, хоць ніводзін мужчына там яшчэ не пабываў. Але я часта чую, калі яны купляюць на рынку кветкі, то кажуць: «Канец свету». І ўсё ж купляюць і дораць іх сваім каханым і блізкім. Дораць не толькі кветкі. Паэты прысвячаюць вам свае вершы, кампазітары — музыку. А я віншую з цудоўным святам 8 Сакавіка. Шчасця і дабрабыту! Каб вы ішлі па вуліцы, а мужчыны кідалі вам пад ногі кветкі — ружы, якія заўсёды ўвасабляюць прыгажосць і самае галоўнае — каханне!»

# ЯК ПРЫВІЦЬ ЛЮБОЎ ДА ЧЫТАННЯ,

## або Самыя распаўсюджаныя памылкі сучасных мам і тат

*«У мяне двое дзетак. Старэйшы сын не любіць чытаць. Я ніколі не рабіла з гэтага вялікую праблему. Але цяжкасці пачаліся, калі ён пайшоў у школу. Зараз я знаходжуся ў дэкрэтным адпачынку з другім сынам. І хачу не паўтарыць памылак, якія дапусціла ў выхаванні першага дзіцяці. Падкажыце, як мне прывіць малечы цікавасць да чытання?» — звярнулася ў рэдакцыю Таццяна М. з Віцебска.*

**Пра тое, як заахвоціць сучасных дзяцей чытаць, а таксама пра памылкі, якія на гэтым шляху дапускаюць многія бацькі, я паразмаўляла з Алай СПІРЫДОНАВАЙ, якая праводзіць для віцебскіх хлопчыкаў і дзяўчынак «Чароўныя чытанні пад зялёным абажурам», і з Кацярынай ТАБЕРКАЙ, стваральніцай блогу «Кніжны шкап» з Брэста. Дарэчы, пра Кацярыніну дачку Дарыю «Звязда» ўжо пісала. Дзяўчынка праславілася тым, што ў шасцігадовым узросце ведала на памяць сотню кніжак.**

### ДЗЕЦІ НЕ ЧЫТАЮЦЬ? ВІНАВАТЫ БАЦЬКІ!

«Я перакананa, што няма дзяцей, якія не чытаюць. Проста кожнаму трэба падабраць кнігі, якія спадабаюцца», — кажа Ала Спірыдонава». На сваіх занятках яна вучыць малых атрымліваць задавальненне ад чытання, прывівае літаратурны густ. Таксама Ала вядзе тэматычную старонку ў «Інстаграме». Трымае бацькоў у курсе кніжных навінак, раіць, якія кнігі выбраць для вырашэння пэўных праблем (адаптацыі да дзіцячага садка, пазбаўлення ад дзіцячых страхаў і іншага).

**Некаторыя бацькі стараюцца не чытаць сваім дзецям страшныя казкі. Кацярына ж аддае перавагу арыгінальнаму фіналу «Калабка», дзе... ліса яго ўсё ж такі з'ела.**

«Часта бацькі самі адбіваюць у дзяцей любоў да чытання. Напрыклад, прыводзіць мама сына ў кніжную краму і кажа: «Выбірай, што хочаш». Праз некалькі хвілін хлопчык, радасны, падбягае да яе з коміксам у руках. «Не, гэта не тое, што ты хочаш, ты хочаш штосьці іншае. Гэта кніга бессэнсоўная, адны малюнкі і мала тэксту. Тут няма чаго чытаць. Яна нецікавая». Часта пасля такіх фраз, а іх за шэсць гадоў даводзілася чуць не аднойчы *(у Алы была ўласная дзіцячая кніжная крама «Абажурчык». — Аўт.)*, дзеці наогул сыходзяць з кнігарні са слязамі і без кнігі.

У дзяцінстве галоўнае не тое, каб дзіця чытала вялікія тэксты. Галоўнае — прыцягнуць увагу да кнігі любым шляхам. Падабаюцца дзіцяці малюнкі — няхай разглядае. З часам пройдзе і да чытання. А гвалт, наадварот, можа адбіць ахвоту чытаць назаўсёды».

Ала распавяла, што яе малодшая дачка палюбіла чытаць толькі дзякуючы коміксам. «Калі Вера пайшла ў першы клас, там правяралі хуткасць чытання. Памятаю, як я ледзь не згарэла ад сораму, калі настаўніца сказала: «У вас свая кніжная крама, а дзіця чытае горш за ўсіх у класе». Вядома, можна было сказаць дачцэ: «Сядзі і чытай! Пакуль не прачытаеш, не пойдзеш гуляць». Але мы з мужам выбралі іншы шлях. Усяляк спрабавалі стварыць пазітыўны вобраз чытання, без ціску, бо разумелі, што кніга не можа быць пакараннем. Неяк мы сабраліся ехаць на кніжны кірмаш у Мінск і ўзялі з сабой Верачку. Я ёй тады сказала: «Выбірай, што хочаш». Яна абышла ўвесь кірмаш і са слязамі вымавіла: «Мне тут нічога не спадабалася». Але на шчасце, нам трапіўся комікс пра асліка Арыёля. Гэта вельмі смешная гісторыя ў малюнках пра французскіх школьнікаў у выглядзе жывёл. Мы штовечар чыталі той комікс разам. Пасля гэтага Верына сэрца адтаяла. Цяпер дачка не ляжа спаць, пакуль мы не пачытаем услых. Прычым яна выбірае толькі тыя кнігі, якія хоча. Чытанне — адна з магчымасцяў карысна правесці час з дзецьмі, чаго цяпер не хапае многім сем'ям».

Ала прызналася: яе здзіўляюць бацькі, якія самі не чытаюць, але патрабуюць гэтага ад дзіцяці. «Разумею, што яны прыходзяць пасля работы дадому стомленыя. Ім хочацца адпачыць. Але чаму дзіця, гледзячы на тату і маму, якія ўткнуліся ў тэлефон, планшэт ці тэлевізар, павінна захацець чытаць? Калі перад вачыма будуць бацькі з кніжкай у руках, то яно і само пацягнецца да чытання». Ала раіць мамам і татам пачаць з сябе. Пакласці побач з ложкам кнігу, каб дзіця бачыла, што бацькі чытаюць перад сном. «Дзяліцеся прачытаным і абмяркоўвайце за вячэрай кнігі. Хадзіце разам з дзецьмі на розныя мерапрыемствы ў бібліятэкі, кнігарні. У нашым «Абажурчыку» на ўсіх чытаннях абавязковым пунктам было чаяпіцце з салодкім. Для дзетак гэта дадатковае падмацаванне таго, што чытаць кніжкі — прыемна».

Ала СПІРЫДОНАВА.

Кацярына ТАБЕРКА.

У Алы ёсць дзве крэатыўныя задумы, звязаныя з дзецьмі і кнігамі. Разам з псіхолагам Верай Лабейка яна ўжо пачала распрацоўваць адвент-каляндар, які стане выдатным матывататарам для будучых першакласнікаў, каб яны хацелі ісці ў школу. Ужо знайшлі ілюстратара. Засталося падабраць выдаўца, каб каляндар быў даступны бацькам з любым дастаткам.

А яшчэ Ала хоча стварыць квэст-карту, каб зацікавіць дзяцей родным горадам. З такой картай прагулка па Віцебску набудзе асаблівы каларыт. «У нас хапае цікавых месцаў для сямейных прагулак. У прыватнасці, па вуліцах Суворава і Талстога ў некаторых ліхтарах... жыве персанаж дзядзька Віця. Таксама ў Віцебску можна пакантактаваць з Хатабычам, схадзіць у госці да залатой рыбкі. Ілюстратара я ўжо знайшла. А таксама сустрэлася з мясцовым экскурсаводам, які адгукнуўся дапамагчы скласці такую карту».

### «ДАРЫЦЕ КНІГІ НА КОЖНАЕ СВЯТА!»

Кацярына Таберка лічыць, што пачынаць чытаць дзецям услых варта з нараджэння. Ці нават раней. «Прынамсі, я чытала ўслых і дачцэ, і сыну, яшчэ калі была цяжарнай (так раяць многія сучасныя педагогі-перынатолагі). Давайце ў ручкі немаўляці кніжкі-цацкі ды кніжкі-кардонкі. Чытайце за сняданкам ці нават калі малеча сядзіць на гаршку. Але лепш за ўсё зрабіць традыцыйным заспакаяльнае чытанне перад сном. Няхай гэта стане прыемным рытуалам. Прычым чытаць трэба павольна, выразна прамаўляючы ўсе гукі, змяняць інтанацыю і голас у залежнасці ад таго, які персанаж кажа. Не варта рабіць гэта сілком, калі дзецям хочацца пагуляць і пабегаць. Лепш чытаць менш, але рэгулярна».

Калі дзеці падрастуць, Кацярына раіць бацькам праяўляць фантазію. Можна ладзіць спектаклі па прачытаных кнігах, з афішамі і квіткамі. Ёсць мноства варыянтаў хатняга тэатра: касцюміраваны, пальчыкавы, магнітны, ценяў, папяровы, марыянетачны. Няхай дзіця выконвае адну з роляў. Пасля двух гадоў можна звадзіць малечу ў лялечны тэатр і паглядзець пастаноўку любімай казкі.

«Фантазіруйце, перарабляйце старыя казкі на новы лад, прыдумляйце свае варыянты развіцця сюжэта, тым самым вы сфарміруеце ў дзіцяці творчае ўяўленне. Прасіце маленькага чытача пераказаць невялікія ўрыўкі па малюнку, гэта выдатна развівае маўленне. Можна стварыць уласны мультфільм-комікс. Няхай дзіця з вашай дапамогай успомніць і схематычна намалюе асноўныя сцэны, а потым, абапіраючыся на карцінкі, паспрабуе агучыць «мультфільм». Прыдумляйце разам гісторыі, малюйце ілюстрацыі і рабіце самаробныя кнігі бабулям і дзядулям. Галоўным героем можа быць і само дзіця, а ўласная казка дапаможа яму вырашыць праблему, пераадолець страх ці навучыць нечаму новаму».

Некаторыя бацькі стараюцца не чытаць сваім дзецям страшныя казкі. Кацярына ж аддае перавагу арыгінальнаму фіналу «Калабка», дзе... ліса яго ўсё ж такі з'ела, бо лічыць, што лепш, каб малеча пражывала свае негатыўныя эмоцыі ў выдуманым свеце і вучылася з імі спраўляцца дзякуючы кнігам.

Але ж самае галоўнае, паводле слоў Кацярыны, — асабісты прыклад і хатняя бібліятэка. «Вылучыце асобную паліцу для захоўвання дзіцячых кніг. Прыгожа яе афармеце, не забыўшыся спытаць парады ў вашага галоўнага чытача. Каб дзеці чыталі, яны мусяць расці ў акружэнні кніг. Згодна з даследаваннямі навукоўцаў, наяўнасць добрай хатняй бібліятэкі ўплывае на будучы ўзровень адукацыі дзіцяці нават больш, чым адукаванасць бацькоў».

Дзіця расце, развіваецца і, вядома, задае шмат пытанняў. Разам шукайце адказы ў слоўніках ды энцыклапедыях, зрабіце традыцыйнымі сямейныя чытанні. Дарыце кнігі малому на кожнае свята разам з іншымі падарункамі. Калі дзіця ідзе да кагосьці ў госці, уключайце кнігу ў падарунак як нешта асаблівае. Кнігі, мабыць, адзінае, чым нельга распесціць, яны не выклікаюць перасычэння, як цацкі ці адзенне.

«Важна выхоўваць стаўленне да кніг як да нечага каштоўнага. Тлумачыць, што іх нельга кідаць на падлогу, камячыць ці рваць старонкі. Пасля таго як пачыталі, трэба абавязкова класці на месца. Пры свядомых спробах сапсаваць кнігу прыбярыце яе ў шафу і растлумачце, чаму вы так зрабілі».

Кацярына Таберка раіць працягваць чытаць дзіцяці ўслых нават тады, калі яно само навучыцца чытаць. «Чытанне — гэта не толькі прыемнае баўленне часу — яно спрыяе развіццю вобразнага мыслення і інтэлекту, пісьменнасці, аблягчае працэс навучання і атрымання новых уражанняў, бо з кожнай прачытанай кнігай дзіця становіцца багацейшым на цэлы свет іншага чалавека».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
**Фота з асабістага архіва Алы СПІРЫДОНАВАЙ і Кацярыны ТАБЕРКІ.**

### 5 МАЛЕНЬКІХ ХІТРЫКАЎ АД КАЦЯРЫНЫ ТАБЕРКІ, ЯКІЯ ДАПАМОГУЦЬ ЗАЦІКАВІЦЬ ЧЫТАННЕМ НАВАТ САМАГА НЯЎРЫМСЛІВАГА І АКТЫЎНАГА МАЛОГА

**Спакуса.** Выберыце кнігу, якая можа зацікавіць дзіця, сядзьце наводдаль і пачніце гучна і выразна чытаць яе самі сабе. Калі малеча не далучаецца, прыхініце старонку рукой, як быццам чытаеце нешта звышсакрэтнае.

**Аўдыязапіс.** Купіце кнігу з CD-дыскам. Навучыце дзіця карыстацца прайгравальнікам, каб яно магло само ўключаць запіс, слухаць яго і адначасова гартаць ілюстрацыі. Але не захапляйцеся — праслухоўванне дыскаў не заменіць жывы мамін голас і абмеркаванне прачытанага.

**Падпіска.** Падпішыцеся на цікавыя для дзіцяці часопісы на яго імя, для гэтага схадзіце разам на пошту.

**Чароўнае з'яўленне.** Паклапаціцеся пра тое, каб новая кніга з'яўлялася ў доме незвычайным чынам. «Пошта» можа прыйсці па пошце, «Востраў скарбаў» можна разам адшукваць па маршруце на пірацкай карце. Увайшоўшы ў дом з «Энцыклапедыяй гномаў» скажыце, што толькі што атрымалі гэтую кнігу ад гномаў, і яны прасілі прачытаць яе малому. Пішыце лісты ўпадабаным героям (тут, магчыма, давядзецца дасылаць ад іх адказы). Завядзіце «чарадзейны куфар», у якім часам будуць з'яўляцца кнігі на самыя актуальныя для дзіцяці тэмы.

**Інтрыга.** Падчас чытання з малымі рабіце невялікія паўзы на самых цікавых месцах. Са старэйшымі дзецьмі, чытаючы адну і тую ж кнігу некалькі дзён, перарывайцеся ў інтрыгоўных момантах. Такое чытанне з працягам не толькі падтрымлівае цікавасць, але і садзейнічае развіццю памяці і ўважлівасці.

Псіхалогія адносін

# ТАКІЯ РОЗНЫЯ...

**Чаму мужчынам і жанчынам часам бывае так цяжка знайсці гармонію і згоду? Што прадстаўнікі моцнай і цудоўнай палоў чалавецтва не разумеюць у паводзінах адно аднаго? Вечныя пытанні абмяркоўваем з псіхолагам Таццянай ШАРАНДАЙ.**

## ЧАГО НЕ РАЗУМЕЮЦЬ МУЖЧЫНЫ

— Некаторыя жаночыя асаблівасці выклікаюць здзіўленне ў большасці мужчын, — кажа Таццяна Шаранда. — Напрыклад, іх здольнасць гаварыць аб усім, шмат і адразу, адначасова групаваць шмат заданняў, а таксама іх дзіўны «талент» жыць у свеце ўласных фантазій. Дзяўчаты часта чакаюць ад партнёраў, каб яны адпавядалі герояm без страху і папроку, пра якіх яны чытаюць у кнігах і глядзяць фільмы, і... горка расчароўваюцца, выяўляючы, што абраннікі вельмі далёкія ад «ідэалу». Мужчыны часта нават не падазраюць, якія высокія патрабаванні прад'яўляюць да іх у думках сяброўкі.

Прадстаўнікоў моцнага полу часта ставіць у тупік здольнасць прыгожай паловы «дабудоўваць» у сваіх галовах тую ці іншую інфармацыю, якую яны вербальна і невербальна атрымліваюць. Накшталт «ён уздыхнуў — гэта значыць, я дрэнная і дурная». Часам проста неверагодна, як жанчыны могуць «з мухі зрабіць слана». Для мужчын, як правіла, недаступная «жалезная жаночая логіка». Затрымаў погляд на формах прыяцелькі ці калегі, міла размаўляў з ёй, залішне галантны — «усё ясна, значыць, здраджвае з ёй». І вось ужо скандал, абвінавачванні ў тым, што ён гатовы бегаць за кожнай спадніцай.

## ЧАГО НЕ РАЗУМЕЮЦЬ ЖАНЧЫНЫ

— Традыцыйная і найбольш распаўсюджаная жаночая прэтэнзія да партнёраў — эмацыянальны голад, недахоп цяпла, праяў любові, увагі, клопату, — дзеліцца сваімі назіраннямі Таццяна Шаранда. — Па прычыне асаблівасцяў сваёй псіхікі і напрацаваных сацыяльных стэрэатыпаў прадстаўніцы прыгожай паловы заўсёды маюць патрэбу ў пацвярджэнні пачуццяў з боку мужчыны, ім складана зразумець іх стрыманасць. Жанчыне пастаянна неабходна чуць і бачыць, што мужчына яе кахае. «Пагавары са мной, абдымі мяне, не едзь да сяброў на пікнік!» — вельмі тыповыя просьбы да спадарожнікаў жыцця.

З гадамі жанчыны ўсё больш паглыбляюцца ва ўнутраны свет сям'і, абрастаючы бытам, а мужчыны ўсё больш накіроўваюцца ў свет знешні. Жонкі інтуітыўна адчуваюць, як іх спадарожнікі паступова аддаляюцца ад іх, ад удзелу ў праблемах сям'і. Часам гэта прыводзіць да таго, што плячо дочкам падстаўляюць бацькі, што нярэдка становяцца трыгерам развалу шлюбу.

Жанчыны па прыродзе сваёй манагамныя, ім цалкам хапае для шчасця аднаго мужчыны. Гэтага ж яны, як правіла, чакаюць і ад сваіх абраннікаў. Ім складана бывае зразумець і прыняць, што эвалюцыйны механізм працягу роду (які па жаданні змяніць немагчыма) падштурхоўвае моцную палову максімальна «паклапаціцца» пра вялікую колькасць нашчадкаў. Веданне асаблівасцяў мужчынскай псіхікі дапамагае самым мудрым жонкам не хвалявацца з-за праяўленай партнёрам цікавасці да іншых «спадніц».

## РОДАМ З РОЗНЫХ ПЛАНЕТ?

***— Таццяна Міхайлаўна, ці апраўдана перакананне многіх жанчын у тым, што мужчыны не ўмеюць слухаць?***

— Не. Мужчыны часта слухаюць лепш, чым жанчыны. Проста яны інакш рэагуюць. Напрыклад, жанчыне хочацца падзяліцца з мужам праблемамі на працы, яна разлічвае на тое, што ён суцешыць яе, падтрымае. А мужчына замест таго, каб выслухваць падрабязнасці, адразу прапануе канструктыўныя рашэнні, варыянты выхаду з сітуацыі. Праўда, часам яны гучаць досыць катэгарычна: «звальняйся», «сядзі дома». Жанчына, натуральна, крыўдзіцца: яна чакала не такіх парад, ёй патрэбна была перш за ўсё падтрымка і эмацыянальны ўдзел.

***— Але самі мужчыны не любяць, калі іх павучаюць і нешта ім раяць...***

— Мужчыны часта расцэньваюць гэта як недавер да ўласных здольнасцяў. Для іх важна дасягаць усяго самастойна і заставацца заўсёды на вышыні ў вачах жанчын, адчуваць сваю значнасць і атрымліваць ад гэтага задавальненне.

***— Ці згодныя вы са сцвярджэннем: для мужчыны важна, ШТО кажуць, а для жанчын — ЯК? Ці праўда, што мужчыны разумеюць усё літаральна, а для жанчын велізарнае значэнне мае інтанацыя і невербальныя інфармацыя?***

— Вельмі важнае пытанне. На гэтай глебе нараджаецца вялікая колькасць сямейных канфліктаў. Гэта міф, быццам мужчынам усё роўна, як падаецца інфармацыя. Але для іх сапраўды важнейшы змест, бо ён падахвочвае да пэўных дзеянняў, да рухальнай актыўнасці, якая для прадстаўнікоў моцнага полу — біялагічная норма. Менавіта таму мужчынам трэба казаць, з аднаго боку, карэктна, а з другога — канкрэтна. Жанчыны ўмеюць «чытаць паміж радкоў», у іх лепш, чым у мужчын, развітая інтуіцыя. Гэта, безумоўна, плюс пры ўмове псіхічнай ураўнаважанасці. У адваротным выпадку такая здольнасць можа вельмі дрэнна адбіцца на ўзаемаадносінах.

***— Вельмі частая скарга жанчын: муж пастаянна забывае, што і куды паклаў, не бачыць таго, што ў яго перад самым носам, не заўважае новую сукенку і прычоску. Тройчы паўтараеш яму, што купіць у краме, і ўсё адно забудзе ці пераблытае. Чым гэта тлумачыцца?***

— Кватэра — гэта прэрагатыва жанчын, таму там мужчына арыентуецца горш. А вось у гаражы, дзе ён гаспадар, нават пры поўным беспарадку лёгка знойдзе патрэбную прыладу. Муж у краме са спісам прадуктаў, які склала жонка, — поўны правал для менеджара па продажах: ён выконвае пастаўленую задачу, абсалютна не паддаючыся рэкламным прапановам.

На вашу прычоску ці сукенку ён і праўда можа не звярнуць увагі, затое вельмі хутка заўважыць адсутнасць грошай на картцы, бо гэта вобласць яго адказнасці — ён павінен яе папаўняць. Муж не чуе, не бачыць, блытае звычайна ў межах сям'і: не ведае, як сабраць дзіця ў школу, як рабіць з ім урокі і гэтак далей. Але калі здарылася праблема з машынай ці паўсталі складанасці на працы, то нагадваць пра гэта яму не трэба: ён не забудзе і самастойна вырашыць іх.

***— Чаму жанчыны добра памятаюць даты важных падзей — дзень вяселля, дні нараджэнняў блізкіх, а большасць мужчын — не?***

— Такія даты эмацыянальна афарбаваныя і таму маюць значэнне перш за ўсё для жанчын. Для мужчын яны носяць чыста намінальны характар. Але калі прадстаўнік моцнай паловы шануе сваіх спадарожніц, то лёгка ўключаецца ў гэтую гульню, каб зрабіць ёй прыемнае.

***— Мужчыны могуць доўга размаўляць з людзьмі і нічога пра іх не ведаць, з жанчынамі такое бывае рэдка. Чаму?***

— Я сказала б інакш. Мужчына можа не ведаць пра колькасць дзяцей, пра ўнутрысямейныя праблемы сваіх знаёмых, таму што яму гэта нецікава, ён не надае значэння такой інфармацыі. Для прадстаўнікоў моцнага полу людзі — перш за ўсё аб'екты дзейнасці, і яны разглядаюць усіх менавіта з гэтага пункту гледжання. Жанчыны ставяцца да людзей эмацыянальна, таму хочуць ведаць пра свет іх перажыванняў і пачуццяў.

***— Ці згодны вы са сцвярджэннем: жанчыны хочуць шмат чаго ад аднаго мужчыны, а мужчыны хочуць аднаго, але ад шматлікіх жанчын?***

— Для жанчыны важна, каб мужчына ўвесь свой час, клопат і ўвагу аддаваў ёй. Яна не гатовая дзяліць яго з іншымі, і на гэта ёсць жалезная падстава — адказнасць за выццё і дабрабыт дзяцей. Для мужчын жа, каб забяспечыць выжывальнасць роду, заўсёды вялікае значэнне мела іх здольнасць да шматлікіх кантактаў, узнаўлення нашчадкаў. Цяпер такой неабходнасці ў палігаміі няма, але найстаражытнейшы закон не адменіш. Для моцнай паловы спакушэнне жанчын, павышэнне ўласнай значнасці ў іх вачах заўсёды застаюцца актуальнымі. Да таго ж гармон тэстастэрон стымулюе спаборніцтва мужчын у барацьбе за колькасць заваяваных жаночых сэрцаў. Змагацца з гэтым няма сэнсу.

**Вольга ПАКЛОНСКАЯ.**

З канверта

# ЧАЯВЫЯ

— Вам паслаць разам? — спытала я на ўсялякі выпадак.

— Не, — адказала Лора.

— Так, — пагадзіўся Юра.

Я паслала ім у розных пакоях:

— Разбярацеся, не маленькія. Мне трэба ісці на працу.

Вярнуўшыся, я заспела скандал і хутка рэціравалася на кухню, каб не ўмешвацца. Маладыя сварацца — толькі цешацца, хоць... Лора і Юра — пенсіянеры. Не паспела я распакаваць сумку, як на кухню ўляцела Лора.

— Вось дзе сядзіць! Дастаў! Вось дзе ён у мяне! — яна правяла рукой па горле.

— Што не падзялілі?

— Ідыёт! Не разумее слоў! У нас нічога няма і быць не можа!

— На яго месцы я спадзявалася б — ты ж з ім паехала адпачываць!

— Ну і што? Мы сябры, не больш!

Лора злавалася. Яна і Юра сустракаліся каля трох гадоў. Сяброўства паміж мужчынам і жанчынай — справа сумнеўная. Юра за час іх дружбы двойчы зрабіў ёй прапанову рукі і сэрца. Яна не адмовіла і не пагадзілася.

А пазнаёміліся яны ў санаторыі. Абодва былі на рэабілітацыі, яна — пасля аперацыі на сэрцы, а ён — пасля інфаркту.

Лора прыехала ў санаторый з маленькім тэлевізарам, але не ўзяла антэну. У пошуках чаго-небудзь, што можна часова выкарыстоўваць як антэну, яна абследавала месцы агульнага карыстання і выявіла накручаны на трубу ацяплення дрот. Каб яго зняць, патрэбна была дапамога. За справу ўзяўся мужчына з суседняга пакоя. Гэта і быў Юра. Зрабіць з дроту антэну для яго не складала вялікай праблемы.

Гаварыў ён няшмат, паводзіў сябе сціпла. Лора працавала ў дзіцячым доме і звярталася да Юры, калі ў групе ламалася тумбачка або выключальнік. Ён рамантаваў. Супрацоўніцы дзіцячага дома так і завіхаліся каля Юры: то гарбатай частавалі, то пірожнымі.

Калі Лора мінулы раз сабралася ў санаторый, Юра напрасіўся ў кампаньёны. Адмовіцца не выпадала — чалавек жа стараўся ва ўсім дапамагчы. Паехалі разам. Сустракаліся за сняданкам, а расставаліся пасля танцаў. Але ўсё было ціха-мірна...

А апошнім разам у санаторыі Юра як з ланцуга сарваўся.

— Так атрымалася, што ён аплацію пуцёўкі — сам прапанаваў, я не напрошвалася. Потым пытаецца: «Чым расплачвацца будзеш?». Я ад гэтых слоў выпала ў асадак. Добрыя жартачкі!

У Юры адназначна былі на Лору віды. Ды і Лора, раз ездзіць з ім адпачываць, таксама мае нейкі намер. Мужчына сур'ёзны, разважлівы. А раптам усё складзецца?

— Не гарачыся, — параіла я, — мужчына спакойны, станоўчы. Падумай над яго прапановай.

Юра пяты год быў у разводзе з першай жонкай. Жыў у адной кватэры з дарослай дачкой. На Лорыны жарты «Жаніцца не збіраешся?» адказваў: «Толькі на табе». Але Лора не хацела мяняць свой жыццёвы ўклад і адказвала, што яе задавальняе сяброўства.

Яны пражылі ў мяне тыдзень і кожны дзень сварыліся... З'язджалі раніцай, якраз у дзень майго нараджэння. Мы прыселі на дарожку, і я зноў падумала, што нядрэнна было б іх пажаніць.

— Вы добра гледзіцеся разам, — сказала я. — Можа, яшчэ на пару дзён застаняцеся?

— Не, на жаль, білеты набылі месяц таму, — адказала Лора і працягнула мне скрыначку з духамі. — З днём нараджэння! Гэта асабіста ад мяне.

Пад'ехала таксі. Я пацалавала Лору і падала руку Юру:

— Не сварыцеся!

Юра нахіліўся да майго вуха:

— Я пакінуў свой падарунак і плату за пражыванне ў кухні на стале.

— Што вы? — здзівілася я. — Не варта было турбавацца! А за пражыванне з сяброй грошы не бяруць.

— Пярэчанні не прымаюцца! — адказаў Юра і з гонарам паглядзеў на нас з Лорай.

Гэтая фраза была адрасавана і ёй.

Яны з'ехалі, а я вярнулася дадому, крыху здзіўленая. На стале ляжаў «падарунак» Юры: сабраная з усіх кішэняў дробязь, прыкладна роўная суме, якую пакідаюць афіцыянту «на чай».

І тут я зразумела Лору...

**Валянціна БЫСТРЫМОВІЧ.**

# Извещение о проведении 30 марта 2022 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белстройматериалы»

| Предмет торгов |
|---|
| Изолированное помещение с инв. № в ЕГРНИ 500/D-7114724 общей площадью 257,5 кв. м (наименование: помещение неустановленного назначения; назначение: помещение неустановленного назначения) |
| Местонахождение: г. Минск, ул. Бабушкина, 48-1 |
| Начальная цена: 88 128,00 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 8 800,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «Белстройматериалы», пр-т Партизанский, 99а, 220021, г. Минск, тел. (017) 342-71-92.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 363-25-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ОАО «Белинвестбанк», центр банковских услуг № 527, г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП получателя – 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа на срок до 3 месяцев после заключения договора купли-продажи.

Торги проводятся 30 марта 2022 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 04.03.2022 по 28.03.2022 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефонам: (017) 272-55-57, (029) 302-68-86.

Телефоны для справок:
(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 240-35-94, (029) 685-19-65 (ОАО «Белстройматериалы»).

# ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «Гомельский винодельческий завод»** (УНП 400051877) 246003, г. Гомель, ул. Рогачевская, 10, тел. +375 (232) 71-38-55 в лице антикризисного управляющего Костяна Дмитрия Александровича.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **18 марта 2022 г. 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Имущество филиала «Пиревичский спиртзавод» ОАО «Гомельский винодельческий завод» *с обременением**, Гомельская обл., Жлобинский р-н, аг. Пиревичи, ул. Суворова, 4 А | 2 322 980,81 |
| 2 | Имущество филиала «Рогачевский» ОАО «Гомельский винодельческий завод», Гомельская обл., г. Рогачев, ул. Богатырева, 36 | 66 360,00 |
| 3 | Имущество филиала «Речицкий» ОАО «Гомельский винодельческий завод», Гомельская обл., г. Речица, ул. Винзаводская, 4 | 248 789,66 |
| 4 | Имущество филиала «Чечерский» ОАО «Гомельский винодельческий завод», Гомельская обл., г. Чечерск, ул. Советская, 72А | 48 832,22 |

Подробнее с составом лотов можно ознакомится на сайте beltorgi.by. Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 04.03.2022 г. 09.00 по 17.03.2022 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Крызіс, які цяпер адбываецца ў Малдове, — прамое наступства курсу на ўступленне ў Еўрапейскі саюз, перакананы палітычны эксперт Аляксандр Дудчак. «Першапачаткова выклікалі сумневы вынікі выбараў, па выніках якіх Мая Санду прыйшла да ўлады, — заўважыў ён. — Не ведаю, якія адэкватныя людзі маглі падтрымліваць так званы еўрапейскі вектар, калі пад носам прыклад Украіны».

Празаходні ўрад дзейнічае ў Малдове са жніўня мінулага года. «За гэты час выраслі ў тры разы тарыфы на газ, і сітуацыя не зменіцца да лепшага. Падаражэлі хлеб і праезд у аўтобусах. Ніякіх сур'ёзных зрухаў па барацьбе з распаўсюджваннем каранавіруса і наступствамі пандэміі не адбылося. Не здарылася нічога такога, што б спрыяла выпрацоўцы адзінага падыходу да ўзаемадзеяння з насельніцтвам, да яго аб'яднання, а не далейшага раз'яднання, — лічыць прафесар НДУ «Вышэйшая школа эканомікі», кіраўнік аддзела чарнаморска-міжземнаморскіх даследаванняў Інстытута Еўропы РАН Кацярына Энціна. — Цяперашні ўрад правакуе далейшы раскол малдаўскага грамадства. На думку вучонай, малдаўская ўлада спрабуе вырашэнне ўсіх бед ускласці на плечы насельніцтва. Але бясконца так працягвацца не можа.

Тым часам стала вядома, што ў Кішынёве выстройваюцца доўгія чэргі па сацыяльны хлеб. Людзі займаюць месцы яшчэ да світання. Адпускаюць не больш чым тры боханы ў адны рукі. «Больш не даюць, відаць, каб усім хапіла. Многія маюць патрэбу», — адзначыў тэлеканалу «МІР-24» жыхар Кішынёва Дзмітрый Чэкан. «Звярніце ўвагу, колькі хлеба прывезлі і колькі людзей маюць патрэбу ў гэтым хлебе. Альбо булачных мала, альбо нас, бедных, шмат. Дзяржава думае аб гэтым?» — узрушана заўважыў яшчэ адзін жыхар малдаўскай сталіцы. Адказ відавочны. Каментарыі тут пэўна залішнія.

**Пётр ДУНЬКО.**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

# Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белшина», г. Бобруйск, ш. Минское, 4 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Лот № 1 Месторасположение: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Трудовая, 1А** | | |
| **Здание заводоуправления** | 2 935,2 кв. м | 730/С-12820 |
| В состав лота входят следующие сооружения: **подъездная дорога** (1234 кв. м, инв. №730/С-17065); **ограждение** (240 кв. м, инв. № 730/С-17063); **ограждение** (148 кв. м, инв. № 730/С-17062); **участок канализации** (97,8 м, инв. № 730/С-17060); **ввод водопровода** (9,7 м, инв. № 730/С-17061). | | |
| ***Сведения о земельном участке*:** пл. **1,0277 га,** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 20.08.2065) для обслуживания здания заводоуправления | | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 193,20 бел. руб.** (снижена более чем на 90 %) | | |
| **Лот № 2 Месторасположение: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Трудовая, 1/1** | | |
| **Незавершенное законсервированное капитальное строение (здание административно-хозяйственное)** | 7 458 кв. м | 730/U-15754 |
| ***Сведения о земельных участках:*** пл. **0,3478 га**, **0,0005** и **0,0005 га,** предоставлены продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания незавершенного законсервированного капитального строения | | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 38,40 бел. руб.** (снижена более чем на 90 %) | | |
| **Лот № 3** Месторасположение**: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 164** | | |
| **Картофелехранилище** | 3052,4 кв. м. | 710/С-60715 |
| Составные части и принадлежности: крыльцо(а), эстакада, технич. этаж | | |
| **КПП овощехранилища** | 8,1 кв. м. | 710/С-58338 |
| **Ограждение овощехранилища** | 98,20 м | 710/С-81026 |
| Составные части и принадлежности: ограждения, двое ворот | | |
| **Ограждение овощехранилища (с воротами)** | 138,18 м | 710/С-57185 |
| Составные части и принадлежности: три ограждения, ворота | | |
| **Площадка (внепромыш. территория) асфальтобет. покрытие** | 3461кв. м | 710/С-73308 |
| **Автомобильная дорога (внепромыш. территория) асфальтобет. покрытие** | 362 кв. м | 710/С-73307 |
| **В состав лота входит имущество:** ограждение для мусорных контейнеров (инв. номер по бух. учету 13002000482), шкаф ШП-1 (инв. номер по бух. учету 03386400001), щиты автоматические (инв. номера по бух. учету 03387000008, 03387000009, 03387000010) | | |
| ***Сведения о земельном участке*:** пл. **0,9248 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания картофелехранилища | | |
| **Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 316 204,40 бел. руб.** (снижена на 30 %) | | |
| **Лот № 4** Месторасположение**: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Гагарина, 12** | | |
| **Столовая** | 2098,2 кв. м | 710/С-57661 |
| Составные части: подвал, два крытых крыльца, два крыльца, ворота, асфальтное покрытие, забор | | |
| **Склад** | 125 кв. м | 710/С-60480 |
| **Склад кирпичный (к столовой №9)** | 97,8 кв. м | 710/С-76250 |
| Составные части и принадлежности: ворота, забор | | |
| **Ограждение площадки для мусора** | - | 710/С-57176 |
| **Тепловая сеть к столовой № 9** | 20,2 | 710/С-79760 |
| В состав лота входит сооружение, оборудование и товарно-материальные ценности – перечень на сайте организатора аукциона (cpo.by) | | |
| ***Сведения о земельном участке*:** пл. **0,6237 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений по хранению и переработке продуктов питания | | |
| **Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 384 924,13 бел. руб.** (снижена на 40 %) | | |

**Лоты №№ 5 – 48**
Месторасположение**: Могилевская обл., г. Кричев, ул. Трудовая, 1**

| Номер лота | Наименование | Инвентар. № по бух. учету | Начальная цена лота, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 5 | **Линия автоматизированная для изготовления обуви из полимерных материалов модель Л 2/6** | 517 | **33 485,51** |
| 6 | **Пресс вулканизационный для обуви 101082/Р1** | 428/1 | **1 782,36** |
| 7 | **Пресс вулканизационный для обуви 101082/Р1** | 428/3 | **1 782,36** |
| 8 | **Пресс вулканизационный для обуви 101082/Р1** | 428/4 | **1 782,36** |
| 9 | **Пресс вулканизационный для обуви 101082/Р1** | 428/5 | **1 782,36** |
| 10 | **Пресс вулканизационный для обуви 101082/Р1** | 428/6 | **1 782,36** |
| 11 | **Пресс вулканизационный для обуви 101082/Р1** | 428/7 | **1 782,36** |
| 12 | **Пресс вулканизационный для обуви 101082/Р22** | 430/2 | **2 332,38** |
| 13 | **Пресс вулканизационный для обуви 101082/Р22** | 430/3 | **2 332,38** |
| 14 | **Пресс вулканизационный для обуви 101082/Р22** | 430/4 | **2 332,38** |
| 15 | **Пресс вулканизационный для обуви 101082/Р22** | 430/5 | **2 332,38** |
| 16 | **Пресс вулканизационный для обуви 101082/Р1** | 444 | **2 336,40** |
| 17 | **Пресс вулканизационный для обуви 101082/Р1** | 444/2 | **2 336,40** |
| 18 | **Пресс вулканизационный для обуви 101082/Р1** | 444/7 | **2 336,40** |
| 19 | **Пресс вулканизационный для обуви 101082/Р1** | 444/8 | **2 336,40** |
| 20 | **Пресс вулканизационный для обуви 101082/Р1** | 444/9 | **2 336,40** |
| 21 | **Пресс вулканизационный** | 359 | **2409,00** |
| 22 | **Автоклав** | 35802 | **14 131,91** |
| 23 | **Пресс вулканизационный** | 361 | **2 414,21** |
| 24 | **Пресс вулканизационный гидровлический 250-600-ИЭ** | 02639000009 | **4 181,48** |
| 25 | **Пресс вулканизационный 250-600-ИЗ** | 02639000012 | **2 502,18** |
| 26 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/Р1** | 1652 | **3 027,67** |
| 27 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/Р1** | 1652/1 | **88 686,11** |
| 28 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/Р1** | 1652/2 | **95 641,21** |
| 29 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/Р1** | 1652/4 | **95 641,21** |
| 30 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/Р1** | 1652/5 | **95 641,21** |
| 31 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/Р1** | 1652/3 | **100 133,12** |
| 32 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/Р1** | 424 | **73 546,07** |
| 33 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/Р1** | 424/1 | **73 546,07** |
| 34 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/Р1** | 426 | **74 518,15** |
| 35 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/Р1** | 426/1 | **74 518,15** |
| 36 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/Р1** | 426/2 | **74 518,15** |
| 37 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/Р1** | 426/3 | **74 518,15** |
| 38 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/Р1** | 549 | **77 263,73** |
| 39 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/Р1** | 551 | **80 406,97** |
| 40 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/Р1** | 551/1 | **80 485,64** |
| 41 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/Р1** | 551/2 | **80 506,96** |
| 42 | **Вальцы 1500** | 362 | **16 585,67** |
| 43 | **Вальцы ПД630 315/315** | 516 | **3 178,85** |
| 44 | **Вальцы ПД1500 660/660** | 1580 | **16 656,92** |
| 45 | **Каландр 5-валковый** | 563 | **2 752,21** |
| 46 | **Каландр 5-валковый** | 548 | **4 253,99** |
| 47 | **Каландр 5-валковый** | 456 | **3231,42** |
| 48 | **Вырубная машина** | 546 | **5 142,06** |

| | |
|---|---|
| **Условия самовывоза и демонтажа оборудования** | Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона |

Задаток **в сумме по лоту № 1 – 193,20 бел. руб., по лоту № 2 – 38,40 бел. руб., по лотам №№ 3–48 – 10 % от начальной цены предмета аукциона** перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **от 1 % до 10 % от итоговой цены продажи предмета аукциона** в течение 3 (трех) дней после проведения аукциона.
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда»: по лотам № 1 и № 2 – 14.01.2022, по лотам № 3 и № 4 – 23.12.2021.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время проведения аукциона – 05.04.2022 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 04.04.2022 до 17.00 по указанному адресу**

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 24 марта 2022 года открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование лотов | Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС (20 %) | Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС (20 %) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Помещение площадью 21,6 кв. м** в изолированном помещении – помещение связи с инв. № 340/D–213112, помещение на 6-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент месторасположения – 1.0. **Адрес:** г. Речица, ул. Советская, 66-2 | **91,26** | 91,26 |
| 2 | **Помещение площадью 18,7 кв. м** в капитальном строении – 3-этажном здании РУПС с инв. № 340/С–28644, помещение на 2-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент месторасположения – 1,0. **Адрес:** г. Речица, ул. Советская, 66 | **79,00** | 79,00 |
| 3 | **Помещение площадью 27,4 кв. м** в капитальном строении – 3-этажном здании РУПС с инв. № 340/С–28644, помещение на 2-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент месторасположения – 1,0. **Адрес:** г. Речица, ул. Советская, 66 | **115,77** | 115,77 |
| 4 | **Помещение площадью 48,0 кв. м** в капитальном строении – здании отделении связи с инв. № 350/С–4458, помещение на 2-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,3. Коэффициент местоположения – 0,9. **Адрес:** г. Гомель, пр. Октября, 81 | **202,80** | 202,80 |

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце:** | Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. 8 (0232)79-69-76 |
| **Срок подачи заявления** | **С 03.03.2022 г. по 22.03.2022 г.** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга». Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY2X, УНП 400395996, **получатель – Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта»,** назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах за лот № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления) |
| **Условия пользования** | Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организация производства (кроме вредных производств) |
| **Размер штрафа** | Лоты №№ 1, 2 – по 2 (две) базовых величины, лот № 3 – 3 (три) базовых величины, лот № 4 – 4 (четыре) базовых величины – согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги, от условий проведения аукционных торгов, согласно действующему законодательству) |

**Срок договора аренды – 5 (пять) лет, шаг аукциона – 10 (десять) %. К участию допускаются только индивидуальные предприниматели или юридические лица. Необходимо в адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором торгов и представить необходимые документы:** копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представителем юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляется оригинал доверенности (документ, подтверждающий, полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов, ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) обязан: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения, за вычетом внесенной им суммы задатка. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества. Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049 (изм. от 14.08.2021 № 465). **Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»);** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by/** в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база». **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232)23-23-54, 23-23-56, 8(029)651-22-19 – Алеся Станиславовна, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества ОАО «Авиакомпания Трансавиаэкспорт» (Продавец)

**Лот № 280222001:** самолет ИЛ-76ТД EW-78779 (сер. № 6706) (без авиационных двигателей), 1988 г. в, инвентарный номер 0799, местонахождение: г. Минск, территория Национального аэропорта «Минск». Начальная цена продажи без учета НДС, доллар США – 522 112,56. Задаток, доллар США – 52 211,26. Шаг электронных торгов – 5 %. Штраф – 20 000,00 долларов США.
**Электронные торги состоятся 25.03.2022 в 10.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»).**
Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «ТОРГИБЕЛ» (http://торги.бел).
Задаток на участие в торгах устанавливается в долларах США. Валюта платежа в счет перечисления задатка: – для резидентов Республики Беларусь – белорусский рубль; – для нерезидентов Республики Беларусь – российский рубль или белорусский рубль.
Расчетные счета для внесения задатков:
в белорусских рублях –
р/с BY85BAPB30127802900100000000
в ОАО «Белагропромбанк», BIC банка BAPBBY2X;
в российских рублях – р/с BY57BLBB30120190055182001006 в ОАО «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», BIC банка BLBBBY2X, УНП 190055182 / ОКПО 37492021. Счет 30111810800000000154 в ПАО Сбербанк Москва Россия, SWIFT код – SABRRUMM, БИК 044525225 / ИНН 7707083893, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в эл. торгах 25.03.2022 (Лот № 280222001). Срок внесения задатка: в рос. руб. – по 21.03.2022; в бел. руб. – по 24.03.2022 до 11.00.
Аккредитация, регистрация и участие в электронных торгах осуществляются на ЭТП «ТОРГИБЕЛ». Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами: 24.03.2022 в 12.00.

**• Организатор электронных торгов:**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • www.торги.бел • e-mail: torgi@ino.by**

# НА СКРЫЖАВАННІ ЧУЖЫХ ІНТАРЭСАЎ

## Каб усё было так, як задумвалася дакументам, падпісаным сто чатыры гады таму ў Брэсце, Беларусі і беларусаў наогул бы не існавала

**Сярод шматлікіх падзей першых дзесяцігоддзяў XX стагоддзя, калі войны і рэвалюцыі мянялі светаўладкаванне, падпісанне Брэсцкага міру, якое адбылося 3 сакавіка 1918 года, мне здаецца, адна з самых невядомых старонак для нават зацікаўленага гісторыяй чалавека. А між тым, у геапалітычным плане гэтая падзея мела вялізнае значэнне, хоць бы таму, што менавіта тады дакументальна аформіліся першыя пункты (ці памкненні) вялікага перадзелу свету, які доўжыцца і да сёння.**

**Каб разабрацца, «хто на кім стаяў» сто чатыры гады назад і якое наша месца ў згаданай падзеі, мы пагаварылі з кандыдатам гістарычных навук, загадчыкам аддзела навейшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі Сяргеем ТРАЦЦЯКОМ.**

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***— Сяргей Аляксандравіч, вось пагадзіцеся: Брэсцкі мір як падзея ў разуменні і веданні многіх беларусаў знаходзіцца ў цені Рыжскага міру, які меў для нас катастрафічныя наступствы — беларускія землі былі падзеленыя па-жывому. Але ж насамрэч тое, што адбывалася за тры гады да гэтага ў Брэсце, не менш важна...***

— Гэтыя два мірныя дагаворы, якія літаральна парэзалі тэрыторыю Беларусі, былі заключаны ў адным месяцы з розніцай у тры гады — Брэсцкі мір 3 сакавіка 1918 года, Рыжскі мір — 18 сакавіка 1921-га... Брэсцкі мір — гэта насамрэч канец вялікай эпохі, калі пачалася геапалітычная перабудова свету. І калі казаць пра яго наступствы для Беларусі, яны нашмат больш катастрафічныя, чым вынікі Рыжскага міру. Толькі тут будзе дарэчы паправіцца: былі б нашмат больш катастрафічнымі, калі б усё развівалася так, як Брэсцкім мірам было прадугледжана.

***— Але ж перагаворы аб заключэнні міру праходзілі фактычна на нашай тэрыторыі — у Брэсце...***

— Калі там у канцы 1917 года распачаліся мірныя перагаворы, у Брэсце, на дзве трэці абязлюдзелым у выніку праведзенай царскімі войскамі гвалтоўнай эвакуацыі 1915 года, у крэпасці знаходзіўся штаб германскага Усходняга фронту...

Брэсцкія мірныя перагаворы вяліся з лістапада 1917 года паміж Савецкай Расіяй і дзяржавамі Чацвярнога саюза (Германскай, Аўстра-Венгерскай і Асманскай імперый і Балгарскага царства).

***— І падчас перагавораў наша тэрыторыя ніякім чынам не разглядалася як месца, на якім беларусы могуць стварыць сваю дзяржаву...***

— Ніякім чынам. Прычым з абодвух бакоў. Бальшавікі Заходняга фронту, якія ўзялі ўладу ў Мінску ў снежні 1917 года, былі рашуча супраць нават аўтаноміі ў складзе Савецкай Расіі. Праўда, у пачатку 1918 года савецкі цэнтральны ўрад усё ж такі патрабаваў вырашыць пытанне з самавызначэннем беларусаў, каб голас беларускага народа прагучаў на Брэсцкай канферэнцыі, каб падчас падпісання мірнага дагавора ўсе беларускія землі ў якасці аўтаноміі былі зафіксаваныя за Расіяй (дарэчы, менавіта гэта і меў на ўвазе Усебеларускі з'езд — аўтаномія ў складзе Савецкай Расіі). А ў студзені 1918 года ў Петраградзе створаны Беларускі нацыянальны камісарыят на чале з Аляксандрам Чарвяковым, які меў на мэце стварэнне беларускай савецкай дзяржаўнасці... Але яны працуюць далёка ад Беларусі, а непасрэдна на нашай тэрыторыі, у Мінску, рэй вядзе кіраўніцтва Заходняга фронту на чале з Аляксандрам Мясніковым, якое, як я ўжо сказаў, супраць любой беларускай дзяржаўнасці.

А Германія дыктавала ўмовы, прычым на правах пераможцаў, якіх інтарэсы нейкіх там беларусаў дакладна не цікавілі. На намаляванай Германіяй карце нам месца ні як дзяржаве, ні як аўтаноміі не было.

***— Але ж ужо да гэтага ў снежні 1917 года, падчас першага Усебеларускага з'езда, беларусы заявілі аб імкненні да нацыянальнага самавызначэння...***

— Першы Усебеларускі з'езд, калі памятаеце, быў разагнаны бальшавікамі, і аб любым дзяржаўным утварэнні беларусаў — савецкім ці нейкім іншым — размова не ішла. Савет Усебеларускага з'езду, які дзейнічаў практычна ў падполлі, абраў сваю дэлегацыю на перагаворы ў Брэст у складзе двух чалавек — Сымона Рак-Міхайлоўскага і Аляксандра Цвікевіча. Яны меркавалі заявіць аб тым, якой бачыць сябе Беларусь у пасляваенным свеце. Былі і яшчэ беларусы, якія спрабавалі заявіць аб сабе ў Брэсце, стоячы на пазіцыі «краёвага патрыятызму». Браты Іван і Антон Луцкевічы, якія на той момант знаходзіліся ў акупаванай немцамі Вільні, арганізавалі Віленскую беларускую раду. Яна прыняла пастанову аб тым, што ў пасляваенным свеце павінна быць адноўлена Вялікае Княства Літоўскае...

А самімі немцамі Вільня праектавалася як сталіца Літоўскага Каралеўства, у склад якога планавалася ўключыць і землі Заходняй Беларусі. Меркавалася, што Літоўскае Каралеўства з германскім прынцам на чале, якое ўключае ў сябе палову нелітоўскіх тэрыторый, будзе ў пасляваенным свеце моцнай процівагай Польскаму Каралеўству, якое так ці інакш цалкам павінна было адысці ў сферу ўплыву Аўстра-Венгрыі. Беларусі тут, як бачыце, няма наогул. Як пісаў адзін з кіраўнікоў германскай арміі фельдмаршал Эрых Людэндорф, калі яны ў 1915 годзе прыйшлі ў Вільню, «мы ўбачылі, што тут ёсць нейкія беларусы, пра якіх мы чулі ўпершыню».

***— Атрымліваецца, перагаворы вяліся толькі паміж Савецкай Расіяй і дзяржавамі Чацвярнога саюза?***

— Ад пачатку так. Але ў працэсе туды прыбывалі новыя дэлегацыі, прычым не такія няўдалыя, як беларуская. Напрыклад, дэлегацыя Украінскай Народнай Рэспублікі, якая да студзеня 1918 года лічыла сябе часткай дэмакратычнай федэратыўнай Расіі. Кіраўнік расійскай дэлегацыі Леў Троцкі не меў нічога супраць, каб украінская дэлегацыя ўдзельнічала ў перагаворах самастойна. Магчыма, ён разлічваў, што яны будуць дзейнічаць супольна з расійскай. Але ўкраінцы ўзялі свой курс — дамовіцца з дзяржавамі Чацвярнога саюза сепаратна.

У хуткім часе ва Украіне пачалася грамадзянская вайна. У снежні 1917 года ў Харкаве ўтвараецца Украінская Народная Рэспубліка Саветаў, якая дасылае ў Брэст сваю дэлегацыю. Троцкі патрабуе, каб і яе дапусцілі да ўдзелу як самастойную. Але дзяржавы Чацвярнога саюза заяўляюць, што не могуць гэтага зрабіць, бо ад Украіны ўжо ёсць свая дэлегацыя. І тады дэлегацыя з Харкава пачынае працаваць як частка дэлегацыі Савецкай Расіі... Рэгенцыйная рада новастворанага Польскага Каралеўства (часовы ўрад пад пратэкцыяй Германіі і Аўстра-Венгрыі) таксама заяўляе аб сваім намеры ўдзельнічаць у перагаворах. Прычым адбываецца гэта на фоне таго, што генерал-паляк Юзаф Доўбар-Мусніцкі падняў мяцеж, адмовіўся падпарадкоўвацца савецкай уладзе і заявіў прэтэнзіі Польшчы на Магілёўскую і Мінскую губерні. Пачаліся зацятыя спрэчкі паміж расійскай і нямецкай дэлегацыямі аб умовах допуску польскай дэлегацыі да ўдзелу ў перагаворах...

А 16 лютага ў Брэст прыбывае дэлегацыя Савета Усебеларускага з'езду — ужо згаданыя Рак-Міхайлоўскі і Цвікевіч. Яны зачытваюць сваю дэкларацыю: у пасляваенным свеце Беларусь павінна быць непадзельнай цэласнай рэспублікай у складзе федэратыўнай дэмакратычнай Расійскай Рэспублікі. Аднак іх фактычна ніхто не слухае. Немцы ўвогуле гавораць: хлопцы, а хто вы такія? Вас паслала не дзяржава, не ўрад, а нейкая незразумелая арганізацыя... Больш за тое, немцы выцягваюць дэкларацыю Віленскай рады, якая спасылаецца на тое, што Усебеларускі з'езд быў разагнаны, а значыць, не правамоцны, і прапануе аднаўленне Вялікага Княства Літоўскага (за якое нібыта выказалася разагнаная бальшавікамі «Беларуская канферэнцыя ў Мінску»)...

***— І якое не было патрэбнае нікому з перагаворшчыкаў...***

— Вядома. А Рак-Міхайлоўскі і Цвікевіч, каб застацца ў Брэсце хоць у якім статусе, далучыліся ў якасці дарадцаў да дэлегацыі УНР, якая якраз у студзені абвясціла сябе незалежнай дзяржавай. Пры гэтым на тэрыторыі самой Украіны развіваюцца цікавыя падзеі. У студзені 1918 года Кіеў займаюць «чырвоныя» і ўрад УНР перабіраецца ў Жытомір. А ўрад савецкай УНР з Харкава перабіраецца ў Кіеў. І прыкладна ў гэты ж час у Данецку ствараецца Данецка-Крыварожская Савецкая Рэспубліка, якая, спаслаўшыся на тое, што Харкаў як сталіца савецкай УНР не патрэбны, сваімі войскамі займае Харкаў. Вось такая катавасія: сем урадаў на Украіне (былі ж яшчэ і Адэская Савецкая Рэспубліка, і Таўрычаская Савецкая Рэспубліка, і асобна Савет рабочых, матроскіх і салдацкіх дэпутатаў Севастопаля, і крымска-татарскі Курултай), якія ваююць паміж сабой за тэрыторыю, за міжнароднае прызнанне... У гэтай катавасіі немцы палічылі, што размаўляць трэба з тымі, на каго можна зрабіць стаўку, — хто не адмаўляе правы прыватнай уласнасці і ў прынцыпе можа быць апорай супраць Расіі, — на УНР, да дэлегацыі якой і далучыліся беларусы як дарадцы...

***— У гэтай, як вы сказалі, катавасіі ўвогуле дзіўна, як хтосьці штосьці мог падпісаць...***

— Германія спачатку падпісала сепаратны мірны дагавор з Украінскай Народнай Рэспублікай, пасля таго як у студзені 1918 года абвясціла незалежнасць ад Расіі. УНР заяўляла аб сваім выхадзе з вайны, адмаўлялася ад сваіх прэтэнзій на Холмскую губерню і на заходнія тэрыторыі, заклікала Германію і Аўстра-Венгрыю ўзяць рэспубліку пад ваенную абарону. За гэта Украіна абавязвалася паставіць у згаданыя краіны вялізныя аб'ёмы харчавання. Прычым не распісвалася, каму колькі, і паміж Германіяй і Аўстра-Венгрыяй распачаліся працяглыя спрэчкі, як падзяліць украінскую кантрыбуцыю.

Што датычыцца дагавора з Расіяй. Урэшце германскі і аўстрыйскі бакі заявілі, што заключаць любы дагавор, які прывядзе да міру. Гэты дагавор падпісалі з бальшавікамі, таму што яны ішлі на мір. Быў бы на месцы бальшавікоў іншы расійскі ўрад, які б дэклараваў выхад краіны з вайны, — дамаўляліся б з ім... Новая дзяржаўная граніца, паводле планаў немцаў, адразала ад Расіі Прыбалтыйскія губерні, Літву, часткова Заходнюю Беларусь... А граніцу паміж УНР і Савецкай Расіяй павінны былі вызначыць самі гэтыя краіны. Прычым немцы дзейнічалі тут па прынцыпе: мы не ўмешваемся, але свае войскі пашлём.

Але Троцкаму ўрэшце ўдалося праціснуць уласную формулу: «Ні міру, ні вайны» — мы мір не падпісваем, але вайну спыняем. Заявіўшы так, ён з'ехаў з Брэста. Прычым у Мінску яму наладзілі ўрачыстую сустрэчу як чалавеку, які абараніў гонар і годнасць рэвалюцыі. Камандуючы Заходнім фронтам Мяснікоў аддаў загад аб пачатку поўнай дэмабілізацыі фронту. Было гэта ў пачатку лютага 1918 года.

А 13 лютага ўжо згаданы польскі генерал Доўбар-Мусніцкі, заявіўшы аб тым, што пераходзіць у падпарадкаванне германскага Усходняга фронту, атрымаў загад ад камандавання фронту распачаць наступленне на Мінск. 16 лютага абвясціла сваю дзяржаўную незалежнасць Літва. Дакладней, Літоўскае Каралеўства, у тых граніцах, якія яму планавала Германія, — з заходнебеларускімі тэрыторыямі. Дарэчы, «Дэкларацыя аднаўлення дзяржаўнасці Літвы» дагэтуль знаходзіцца ў германскіх дыпламатычных архівах. Чаму? Бо германскі бок выкруціў літоўскім палітыкам рукі, вымусіўшы іх уключыць у гэты дакумент і ў германска-літоўскі дагавор аб супрацоўніцтве такія палажэнні, якія прадугледжвалі, што новастворaная літоўская дзяржава знаходзіцца цалкам у арбіце Германскай імперыі.

На фоне гэтых падзей германскі бок заявіў, што калі расійская дэлегацыя не вернецца ў Брэст за стол перагавораў праз тыдзень пасля 18 лютага, перамір'я больш не існуе і баявыя дзеянні будуць адноўлены. А за гэты тыдзень германскія войскі занялі фактычна ўсю тэрыторыю сучаснай Беларусі, выйшлі да Дняпра, да Заходняй Дзвіны, занялі Полацк і пагражалі Віцебску... Пад кантролем савецкай улады застаўся «агрызачак» беларускіх зямель — два дзясяткі паветаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў. А кіраўніцтва Заходняга фронту хуценька з'ехала з Мінска ў першы ж дзень нямецкага наступлення, бо якімі сіламі ім было абараняцца?

19 лютага немцы і польскія легіянеры ўжо ў Мінску, а частку горада кантралююць прыхільнікі Савета Усебеларускага з'езду. Праўда, акупацыйныя ўлады вельмі хутка прымусілі іх зняць сцягі, забралі ўсю казну, якая была, а потым і ўвогуле выгналі з будынкаў.

Германскі бок глядзеў на занятыя ў лютым-сакавіку 1918 года тэрыторыі Беларусі як на залог, які збіраўся трымаць да заключэння ўсеагульнага міру на сваіх умовах. Залог пад тое, што Расія будзе плаціць кантрыбуцыю, і тады, магчыма, праз нейкі час яна атрымае гэтыя тэрыторыі назад.

***— Гэта маецца на ўвазе цэнтральная частка нашай сённяшняй тэрыторыі. Заходнюю частку аддавалі Літоўскаму Каралеўству, а сённяшняе Палессе...***

— А сённяшняе Палессе лічылася часткай УНР, з якой дагавор ужо быў падпісаны... Карацей, беларусам не заставалася нічога. І абвяшчэнне ў сакавіку ў такіх умовах незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі ды яшчэ ў межах рассялення беларусаў (фактычна ў сучасных межах нашай краіны) было дэкларатыўным і не ўваходзіла ў сферу нічыіх інтарэсаў. Самаму моцнаму на той момант баку — немцам — яна была нецікавая, бо абрушыла б усю пабудову міждзяржаўнай сістэмы адносін на ўсходзе Еўропы, якую яны ўзводзілі з такой педантычнасцю, з такім клопатам пра сябе. У гэтай сістэме яны бачылі сябе гегемонамі, а Расія, меркавалася, будзе цалкам выкінута з еўрапейскіх спраў, адрэзаная ад Еўропы дзяржавамі, што знаходзяцца пад германскім пратэктаратам і кантролем...

***— Але гісторыя павярнула пасвойму...***

— Ужо ўвосень 1918 года Германія прайграла вайну на захадзе і, адпаведна, страціла пазіцыі на ўсходзе. Летам 1918 года ў Еўропу праз Атлантыку сталі прыбываць амерыканскія войскі — да восені на кантыненце было ўжо тры мільёны іхніх салдат. Прыплылі і караблі з узбраеннем, выробленым на амерыканскіх заводах. Усё гэта — у дапамогу Антанце, якая ваявала з Германіяй... Нямецкія войскі на ўсходзе пачалі паступова выводзіць з акупаваных беларускіх тэрыторый. 13 лістапада 1918 года Брэсцкі мір быў ануляваны. А вельмі хутка, у студзені 1919-га, пачалася польска-савецкая вайна. Сістэма, якую немцы спрабавалі выбудаваць, правалілася зусім, пачалі стварацца перадумовы для новага мірнага дагавора — Рыжскага.

Калі б умовы і геапалітычны расклад, якія прадугледжваў Брэсцкі мір, захаваліся хоць бы на дзесяць гадоў, пра беларусаў, а тым больш пра іх права на дзяржаўнасць, ніхто б і не ўспомніў. Але гісторыя не церпіць умоўнага ладу. Праз тры гады, падчас падпісання Рыжскага міру, беларусы ўжо мелі сваю рэспубліку — Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку Беларусь. І хоць вынікі гэтага міру былі катастрафічныя для народа, бо падзялілі яго па-жывому на дзве часткі на доўгія васямнаццаць гадоў, дзяржаўнасць захавалася, і слова «Беларусь» (Беларуская Рэспубліка) ужо не знікала з сусветнага парадку дня.

**Гутарыла Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

Кніжны гасцінец

# КРЫЛЦЫ ВОС, КРЫЛЫ БУСЛОЎ

**Якуб Колас. Т. 1, 2. Мінск, «Мастацкая літаратура», 2022.**

«Мой родны кут, як ты мне мілы!.. Забыць цябе не маю сілы!»

Як той казаў, у любой незразумелай сітуацыі звяртайся да класікі.

Чарговыя тамы серыі «Народная бібліятэка» выдавецтва «Мастацкая літаратура» прысвечаны Якубу Коласу. У першы том, згодна з выбарам чытачоў, увайшлі вершы і, зразумела, паэма «Новая зямля» — хрэстаматыя беларускага сялянскага жыцця. У другі том — яшчэ адна культавая паэма, «Сымон-музыка», і апавяданні. Калі «Новая зямля» часта цытуецца, то ў паэме «Сымон-музыка» дасюль знаходзяць патаемныя сэнсы... Дый нават ход стварэння быў цяжкі. Задумаў Колас яе яшчэ ў 1911-м, калі сядзеў у Пішчалаўскім замку, мінскай турме, за ўдзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе. Пасля выхаду на волю работа над гісторыяй таленавітага самавука Сымона дапамагала жыць: *«Утрымаюся за яго, — значыць, не звар'яцею, не сап'юся, наогул, не пайду наніз, у падонкі, у паслугачы»*. Першыя часткі паэмы былі надрукаваныя ў 1917 годзе, ужо ў рэвалюцыйныя гады. Потым паэма дапісвалася... Яе філасофскі, сімвалічны характар, разважанні пра месца мастака ў грамадстве выклікалі шмат нападак вульгарызатарскіх крытыкаў. Коласа абвінавачвалі ў містыцызме, прапагандзе рэлігіі. Ён пакутліва перапрацоўваў паэму... А калі завяршыў работу над новай рэдакцыяй, у 1924-м рукапіс выкралі. Прычым гэта сапраўды дэтэктыўная гісторыя: калі Колас вяртаўся з Кіславодска, дручком выцягнулі з акна цягніка чамадан разам з рукапісам... Дасюль гадаюць — ці гэта быў выпадковы злодзей, які паляваў за рэчамі пасажыраў, або гэта была арганізаваная акцыя... Колас вельмі перайматься, перапрацаваны варыянт так-сяк аднавіў... Паэма ўбачыла свет у 1925 годзе.

**Ізэн Бэнкс. Асіная фабрыка. Масква, Выдавецтва «АСТ», 2022.**

Кніга недарэмна выдадзена ў серыі «Эксклюзіўная класіка». З аднаго боку, раман сапраўды культавы, яго нават уключаюць у сотню найлепшых сучасных раманаў. З другога боку, яго нельга рэкамендаваць да прачытання кожнаму. Гэта так званая альтэрнатыўная літаратура, дзе аўтар свядома раскрывае табіраваныя тэмы і часам шакуе чытача. «Асіная фабрыка» адразу зрабіла Ізэна Бэнкса папулярным, а крытыкі пісалі, што гэта — раман-жах, раман-насланнё, яго ратуе чорны гумар, трохі сюррэалізму і паэтычнасць стылю. Гэткі кактэйль з «Уладара мух» Голдынга, «Завяднога апельсіна» Бёрджэса і «Алісы ў краіне цудаў» Кэрала. Чытаеш і, здаецца, бачыш трылер. Недарэмна Бэнкса называюць літаратурным Таранціна. Пустэльны шатландскі астравок. Дзюны, пясок, суровае мора... У старой сядзібе жыве сямнаццацігадовы Фрэнк Калдхэйм са сваім дзівакаватым бацькам. Бацька — былы хіпі і вучоны-хімік, здаецца, калісьці выкладаў ва ўніверсітэце... Цяпер адгарадзіўся ад свету, займаецца незразумелымі эксперыментамі і змушае Фрэнка запамінаць усе вымярэнні інтэр'еру — якой вышыні стол, якога аб'ёму пакой... Ну і ўнушае, што Зямля — не шар, а стужка Мёбіуса. Ёсць яшчэ брат Фрэнка, які збег з псіхіятрычнай лячэбніцы, — былы студэнт-медык, ён звар'яцеў, убачыўшы агіднае анатамаванне трупа, і ператварыўся ў садыста... Зрэшты, Фрэнк таксама заслугоўвае лячэбніцы. Ён блукае цэлымі днямі па востраве, забіваючы ўсялякую жыўнасць, і існуе ў свеце прыдуманай ім жорсткай рэлігіі. У яго ёсць Ахвярныя слупы, якія нібыта ахоўваюць востраў, а на гарышчы дома своеасаблівае свяцілішча — Асіная фабрыка, сюррэалістычны механізм, куды хлопец запускае жывых вос, рух якіх нібыта прадказвае будучыню... Фрэнк з дзяцінства помсціць свету за сваё калецтва, за непадобнасць да іншых. А потым аказваецца, што помсціць не было за што, і ўсё не такое, якім уяўлялася... А злачынствы ўжо ўчыненыя. «Цяпер выходзіць, што ўсю дарогу я быў блазнам... кожны з нас у сваёй асабістай фабрыцы можа лічыць, што калідор ужо абраны і пастка зачынілася, што мы рухаемся наканаваным маршрутам да таго ці іншага няўхільнага лёсу, — але дастаткова аднаго толькі слова, погляду, досыць спатыкнуцца, і залаты палац ператвараецца ў канаву пры плоце, а пацучыны лабірынт — у зялёную вуліцу. Канчатковы шлях ва ўсіх адзін, а вось маршрут — часткова той, што выбіраем, часткова наканаваны — у кожнага свой і змяняецца ў імгненне вока. Я думаю, мая пастка зачыніліся шмат гадоў таму, а аказваецца, увесь гэты час я толькі поўзаў па цыферблаце. І толькі цяпер рыпіць люк, толькі цяпер пачынаецца сапраўдны шлях».

**Выданні для агляду прадстаўленыя кніжнай крамай «Акадэмічная кніга», Мінск, пр. Незалежнасці, 72.**

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## СЁННЯ

### Месяц

*Маладзік 2 сакавіка. Месяц у сузор'і Рыбы.*

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.54 | 18.50 | 10.56 |
| Віцебск — | 7.45 | 18.38 | 10.53 |
| Магілёў — | 7.44 | 18.40 | 10.56 |
| Гомель — | 7.39 | 18.39 | 11.00 |
| Гродна — | 8.08 | 19.06 | 10.58 |
| Брэст — | 8.07 | 19.08 | 11.01 |

### Імяніны

***Пр.*** *Кузьмы, Льва.*
***К.*** *Марыны, Гераніма, Фелікса.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 3 САКАВІКА

У краіне

**1067** год — адбылася бітва на рацэ Няміга (прыток Свіслачы ў межах сучаснага Мінска) паміж войскамі паўднёварускіх князёў Ізяслава, Святаслава, Усевалада Яраславічаў і полацкага князя Усяслава Брачыславіча. Прычына — намер кіеўскага князя падпарадкаваць Полацкае княства, якое да гэтага часу стала фактычна незалежным. Выкарыстаўшы захоп і спусташэнне Усяславам Ноўгарада, войскі паўднёварускіх князёў захапілі Мінск. Бітва скончылася паражэннем войскаў Полацкага княства. Усяслаў быў узяты ў палон.

**1918** год — падпісаны Брэст-Літоўскі мірны дагавор паміж Германіяй, Аўстра-Венгрыяй, Балгарыяй і Турцыяй з аднаго боку і Савецкай Расіяй з другога. Факт заключэння сепаратнага міру і ўмовы Брэст-Літоўскага мірнага дагавора выклікалі рэзкую рэакцыю як сярод унутрырасійскай апазіцыі бальшавікам, так і на міжнароднай арэне і прывялі да абвастрэння Грамадзянскай вайны. Па дагаворы Расія траціла значныя тэрыторыі — Польшчу, Літву, частку Беларусі, Украіны, усяго каля 1 млн кв. км. Пры гэтым Германія атрымлівала кантрыбуцыю ў 6 млрд марак. Дагавор быў анулявaны рашэннем савецкага ВЦВК ад 13 лістапада 1918 года на фоне рэвалюцыйных падзей у Германіі.

У свеце

**1613** год — 16-гадовы Міхаіл Фёдаравіч быў выбраны Земскім саборам на царстваванне і стаў родапачынальнікам дынастыі Раманавых.

**1847** год — нарадзіўся Аляксандр Бэл, амерыканскі вучоны, адзін з вынаходнікаў тэлефона, а таксама металадэтэктара. Над апошнім прыстасаваннем вучоны працаваў у ліпені 1881 года спецыяльна для таго, каб выявіць дакладнае месцазнаходжанне кулі ў целе прэзідэнта Джэймса Гарфілда, на якога быў зроблены замах.

**1875** год — у Манрэалі, на катку «Вікторыя», адбыўся першы афіцыйны матч па хакеі з шайбай.

Так гаварыла...

**ЛЮДВІГ ВАН БЕТХОВЕН:**

*«Для чалавека з талентам і любоўю да працы не існуе перашкод».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Ён быў настолькі прынцыповым чалавекам, што ўвесь час хадзіў з сіняком пад вокам.**

Мужчына пытаецца ў рыбака, які драмаў з удай каля рэчкі:

— Як сёння вада?

— Цудоўная, рыба наогул не хоча з яе вылазіць.

**Занадта настойлівыя пошукі ісціны ў чырвоным віне нярэдка заканчваюцца белай гарачкай.**

Я калі хвалююся — усміхаюся як дурніца і валасы на палец навіваю. А калі моцна хвалююся, то атрымліваецца лепш, чым на бігудзі.

**— Дарагі, давай сустрэнемся ў пяць гадзін?**

**— Добра. А ў колькі ты прыедзеш?**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звязде», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 603.

Нумар падпісаны ў 19.30

2 сакавіка 2022 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12